Камуністычная партыя (большэвікоў Беларусі)

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№102 (4935)
МАЙ
13
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Прывітанне ЦК КП(б)Б усебеларускай канферэнцыі значкістаў „ЗОТ" лёгкай прамысловасці

ЦК КП(б)Б вітае ў вашай асобе лепшых людзей лёгкай прамысловасці Совецкай Беларусі.

Справа аўладання тэхнікай, барацьбы за якасць прадукцыі, за зніжэнне сабекошту, за поўнае выкананне планаў мае выключнае значэнне для выканання рашэнняў XVII з'езда партыі і ўказанняў таварыша **Сталіна.**

ЦК КП(б)Б упэўнен, што канферэнцыя значкістаў «ЗОТ» з большэвіцкай самакрытыкай абмяркуе работу кожнай галіны лёгкай прамысловасці БССР і намеціць шляхі далейшай барацьбы з яе адставаннем, асабліва па лініі якасных паказальнікаў.

ЦК КП(б)Б асабліва вітае дэлегатаў канферэнцыі — комсамольцаў, ініцыятараў зотаўскага руху, застрэльшчыкаў гэтай выдатнай новай формы соцыялістычнага спаборніцтва.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

АСВОІЦЬ 115.000 ГЕКТАРАЎ ЦАЛІНЫ

Аднаасобныя гаспадаркі БССР на сваіх вузкіх палосках, узброеныя сахой, маглі толькі марыць аб узнаўленні цаліны.

Толькі перамога калгаснага ладу і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў зараз ператварылі пытанне ўзнаўлення цаліны з мары ў сапраўднасць.

І зусім не выпадкова тав. **СТАЛІН** у сваім дакладзе на XVII з'ездзе партыі паставіў перад раёнамі так званай спажываючай паласы задачу асваення 5 млн. гектараў цалінных зямель і стварэння тут вялікага масіва зернавых культур.

«Відома, што клімат у гэтай частцы надрэнны, ападкаў нямала, засухі не бывае. Калі ачысціць гэтыя землі ад хмызняка і правесці рад мерапрыемстваў арганізацыйнага характару, можна будзе атрымаць вялікі раён зернавых культур, які можа даць таварнага зерна пры звычайна вялікай урадлівасці гэтых месц не менш чым дае зараз Ніжняя, або Сярэдняя Волга. Гэта было-б вялікім падспор'ем для паўночна-прамысловых цэнтраў».

Буйнейшым арганізацыйным мерапрыемствам у гэтай галіне з'яўляецца пастанова Совета Народных Камісараў СССР і ЦК ВКП(б) аб ільготах калгасам пячорназемнай паласы, узнімаючым цаліну пад ураджай 1934 года.

Для БССР пастанова аб узнаўленні цаліны мае выключнае значэнне. У Беларусі мы маем сотні тысяч гектараў закінутай пахаці, так званых пералогаў, якія не апрацоўваюцца. Гэта забалочаныя участкі або пяскі. Правядзенне прасцейшай асушкі забалочаных участкаў, запраўка пясчаных глеб арганічнымі ўгнаеннямі дасць поўную магчымасць ператварыць іх ва ўрадлівыя зямельныя масівы.

Нямала зямель мы маем у БССР зарослых хмызнякамі, якія зусім не выкарыстоўваюцца. Гэтыя землі таксама трэба і можна перавесці ў пахаць. Значная частка іх патрабуе асушкі. Частка можа быць асвоена і без асушкі.

Нямала добрай ворнай зямлі можна атрымаць і за кошт асвоення лясных вырубак і асушаных балот.

Старыя лялы, хмызнякі, цаліна, кушністыя сенажаці — багацейшы фонд для расшырэння пахаці, які ёсць у кожным сельсавеце.

Асваенне гэтых зямель дасць магчымасць уключыць у гаспадарчы зварот нашай краіны аграмадныя тэрыторыі, ператварыць гэтыя нязгодныя землі ў высока ўраджайныя масівы зернавых культур.

Улічваючы, што асваенне цаліны патрабуе вялікай напружанасці і затрат, партыя і ўрад далі калгасам, узнімаючым цаліну, рад ільгот: на два гады вызваляюцца ад сельгаспадатку і зернапаставак пасевы калгасаў спажываючай паласы, праведзеныя па цаліне, асвоенай шляхам расчысткі, раскарчоўкі і асушкі. Пасевы, праведзеныя па цаліне, асваенне якой не патрабуе вялікіх работ, вызваляюцца ад падаткаў і паставак на год. За выкананне дзённай нормы, на раскарчоўцы, асушцы і апрацоўцы цаліны калгаснікі налічваюцца 2 працадні. Калгасам, якія вядуць асваенне цаліны, прадастаўляюцца дзяржаўныя крэдыты на набыццё карчавальнага інвентара.

Рад калгасаў БССР, даведаўшыся пра ільготы за ўздым цаліны, адказалі на пастанову партыі і ўрада канкрэтнымі большэвіцкімі справамі.

Калгасы **Барысаўшчыны,** скончыўшы сяўбу, пераключыліся па ўздым цаліны. Калгасы ўжо раскарчавалі 400 гектараў. Узор барацьбы за асваенне новых зямель паказвае калгас **«БОЛЬШЭВІК»,** які за адну толькі гэту вясну павялічвае свае землі за кошт раскарчоўкі і асушкі на 50 гектараў. Да 6-га мая калгас узняў 25 гектараў цаліны і засеяў іх аўсом. За раз калгас асвойвае яшчэ 15 гектараў цаліны і асушвае 15 гектараў балота.

З вялікім задаваленнем сустрэлі пастанову партыі і ўрада калгасы Бабруйшчыны. Калгас імя **Молатава,** Рымавецкага сельсавета, узняў і засеяў яравымі 20 гектараў цаліны. Калгас **«Глуша»** засеяў 10 гектараў. Разгарнулі ўздым цаліны калгасы Віцебскага і Талачынскага раёнаў.

Аднак, не ўсюды зразумелі, якое значэнне мае ўзнаўленне цаліны для стварэння новых зернавых масіваў, для стварэння кармовай базы для соцыялістычнай жывёлагадоўлі і росту калгаснай заможнасці. У большасці раёнаў і калгасаў з уздымам цаліны не спяшаюцца.

Спачатку ўзарэм і пасеем, а потым і за цаліну возьмемся — вось гэта тэорыя і практыка чарговасці вельмі моцна развіта ва ўсіх звеннях зямельных органаў.

У **Уздзенскім** раёне, напрыклад 1.000 гектараў цаліны чакаюць раскарчоўкі, але раённыя арганізацыі амаль нічога не зрабілі, каб узняць калгасныя масы на гэту важнейшую справу. У **Мсціслаўскім і Чэрыкаўскім** раёнах абмежаваліся тым, што склалі планы, прычым у Чэрыкаве лічаць, што ўздым цаліны — гэта справа далёкай будучыні.

Такія адносіны да важнейшай народна-гаспадарчай задачы больш нецярпімы. Раёны і калгасы, якія скончылі сяўбу, павінны зараз усю сваю сілу пераключыць на ўздым цаліны і папару, на асушку і асваенне забалочаных участкаў.

План асваення цаліны ў 115.000 гектараў павінен быць ва што-б там ні стала выкананы.

Зямельныя аддзелы, МТС, сельсоветы павінны дапамагчы калгасам поўнасцю скарыстаць велізарныя ільготы, прадастаўленыя ім пролетарскай дзяржавай, і арганізаваць калгасныя масы на асваенне як мага больш масіваў цаліны зараз у часе веснавой сяўбы.

ДАРАГІ АЛЕКСЕЙ МАКСІМАРЫЧ!

РАЗАМ З ВАМІ СУМУЕМ І ПЕРАЖЫВАЕМ ГОРА ЯКОЕ ТАК НЕЧАКАНА І ДЗІКА ЗВАЛІЛАСЯ НА НАС УСІХ. ВЕРЫМ ШТО ВАШ НЕСАКРУШАЛЬНЫ ГОРКАЎСКІ ДУХ І ВЯЛІКАЯ ВОЛЯ ПЕРАМОГУЦЬ ГЭТА ЦЯЖКАЕ ІСПЫТАННЕ.

ВЫКАЗВАЕМ СВАЁ ГЛЫБОКАЕ СПАЧУВАННЕ НАДЗЕЖДЗЕ АЛЕКСЕЕЎНЕ.

І. СТАЛІН.
В. МОЛАТАЎ.
К. ВАРАШЫЛАЎ.
С. ОРДЖАНІКІДЗЕ.
М. КАЛІН'Н.
В. КУЙБЫШЭЎ.
А. МІКАЯН.
А. ЖДАНАЎ.

СМЕРЦЬ М. А. ПЕШКОВА

11 мая памёр ад крупознага запалення пёгкіх Максім Алексеевіч Пешкоў, сын т. А. М. Горкага, 36 год ад роду.

ПРЭЗІДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ВЫКАЗВАЕ ГЛЫБОКІ ЖАЛЬ ПА ПОВАДУ СМЕРЦІ БУЙНЕЙШАГА АРГАНІЗАТАРА І КІРАЎНІКА БАРАЦЬБЫ З КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯЙ, СТАРШЫНІ АБ'ЯДНАНАГА ПАЛІТЫЧНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ССР Т. МЕНЖЫНСКАГА ВЯЧАСЛАВА РУДОЛЬФАВІЧА.

ПРЭЗІДЫУМ ЦВК БССР.

ВЛАДЗІВАСТОК РЫХТУЕЦЦА К ПРЫЕЗДУ ЧЭЛЮСКІНЦАЎ

ХАБАРАЎСК, 11 мая (БЕЛТА).

9 мая Ляпідаеўскі на самалёце «АНТ-4» прыбыў у бухту Правідзення, даставіўшы тры жанчыны, адно дзіця і аднаго зімоўшчыка. Лётчык Фарых прывёз зімоўшчыкаў з бухты Лаўрэнція ў бухту Правідзення. 10 мая Півенштэйн, Гарэлаў і Фарых вылецелі з бухты Лаўрэнція. Светагораў прыбыў у бухту Эмма (адна з дробных бухт у глыбіні бухты Правідзення). Ён прывёз 6 чалавек з мыса Паўночнога.

***

ХАБАРАЎСК, 11 мая. (БЕЛТА).

З парахода «Смоленск» паведамляюць: ударная камандa машыннага аддзялення заканчвае чыстку катла за трое сутак замест 5 па плану. Заўтра кацёл будзе гатоў.

Самалёты, скарыстоўваючыя пагодныя дні, прадаўжаюць перакідку чэлюскінцаў з бухты Лаўрэнція ў бухту Правідзення. 10 мая ў бухце Лаўрэнція аставаліся ўсяго 24 чэлюскінцы. Астатнія ўжо размешчаны на «Смоленску».

ХАБАРАЎСК, 11 мая. (БЕЛТА).

Владзівасток узмоцнена рыхтуецца к сустрэчы чэлюскінцаў. Горад прыводзіцца ва ўзорны парадак. Рамантуюцца маставыя, афарбоўваюцца будынкі, адкрываюцца сады, бульвары, арганізуюцца скверы. Амаль усё насельніцтва горада прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы к сустрэчы чэлюскінцаў.

БОЛЬШЭВІЦКІМІ ТЭМПАМІ, ВЫСОКАЙ ЯКАСЦЮ, ЛІКВІДУЕМ ЗАЦЯГВАННЕ СЯЎБЫ У АДСТАЮЧЫХ РАЁНАХ

ПА БССР ЗАСЕЯНА 73,6 ПРОЦ. ЯРАВОГА КЛІНА

Паводле даных Наркамзема па БССР на 10 мая засеяна 1.900.822 гектары—73,6 проц. яравога кліна. Соўгасы засеялі 116.234 гектары (50,5 проц.), калгасы—1.069.788 (78 проц.). У тым ліку калгасы МТС—471.958 гектараў (74 проц.), аднаасобнікі—711.448 (72,6 проц.).

Зернавых усяго засеяна 1.110.126 гектараў (87,6 проц.). У тым ліку аўса—522.800 гектараў (98,5 проц.), пшаніцы—130.369 гектараў (73,9 проц.). Ільну засеяна 216 920 гектараў (87 проц.), канаплі—10.244 гектары (33,4 проц.), бульбы—452.193 гектары (73,6 проц.).

Узнята цаліны—2.474 гектары.

АРШАНШЧЫНА СКОНЧЫЛА СЯЎБУ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ, рэдакцыі „ЗВЯЗДА"

Аршанскі раён на 9 мая выканаў план сяўбы яравых. Засеяна 62.712 гектараў—100,2 проц., у тым ліку аўса 109,5 проц., пшаніцы—104,7 проц., ільну—102,1 проц., бульбы—100,1 проц. Пасеялі значна лепш і на 35 дзён раней, чым летась. Сяўба прадаўжаецца.

Сакратар райкома СОСНІН.
Старшыня РВК МІЦЬКОЎ.
Начальнік палітаддзела РАЗУМАЎ.

У МАЗЫРЫ ЗАГРУЗЛІ ПАСЕЎНЫЯ ГРУЗЫ

МАЗЫР, 12. (Па тэлефону ад нашых карэспандэнтаў).

На прыстані Мазыр ляжаць тры тоны насення канапель, прызначаных віцебскай канторы Заготлён. Ляжаць гэтыя канаплі ўжо больш за тыдзень.

Як так доўга ляжаць?—спыталіся мы ў начальніка прыстані Шклярава.

— Мы тут ні пры чым. Наша справа перавезці і выгрузіць. А Саюзтранс не забірае для адпраўкі на чыгунку.

Саюзтранс-жа, у сваю чаргу, абвінавачвае начальніка станцыі Мазыр, які адмаўляецца прымаць груз, як па-запланаўны перавозкі. Усе валяць адзін на другога, кожны лічыць, што ён мае рацыю. А пасеўны груз ляжыць без руху.

Як высветлілася, гэтыя канаплі паступаюць на прыстань у другі раз, розніца толькі ў тым, што раней іх было 8 тон, а зараз 3, і ляжалі раней яны больш 20 дзён, з іх 10 дзён на станцыі Мазыр. Даведаўшыся аб гэтым, нараўлянская кантора Заготзбыту, адгрузіўшая іх, забрала канаплі назад. Але віцебская кантора заявіла пратест. Умяшаліся цэнтральныя арганізацыі. Тады Нароўля пашла на ўступкі і адправіла груз назад, але ўжо не 8 тон, а толькі 3.

Калі цэнтральныя арганізацыі сваім умяшаннем прымусілі Нароўлю вярнуць канаплі назад, чаму-ж яны не клапоцяцца аб хутчэйшай дастаўцы іх у Віцебск.

ФРАЛОЎ, МАЧАЛЬСКІ.

ЦЯЛУШСКАЯ МТС СКОНЧЫЛА СЯЎБУ ЯРАВЫХ

ПЛАН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ КАЛГАСАМІ ЦЯЛУШСКАЙ МТС НА 10 МАЯ ВЫКАНАН ПОЎНАСЦЮ. ЗАСЕЯНА 7.558 ГЕКТАРАЎ — 102 ПРОЦ., У ТЫМ ЛІКУ АЎСА—111 ПРОЦ., ІЛЬНУ — 111, БУЛЬБЫ — 107 ПРОЦ.

ДЫРЭКТАР МТС АЎСЕЕНКА.
НАЧАЛЬНІК ПАЛІТАДДЗЕЛА ЛІХЕРЗАК.

ПАЧАЛІ ПОЛІВА ІЛЬНУ

СЯННО. (Па тэлеграфу). Прапалаты першыя 60 гектараў ільну ў калгасах імя **Карла Маркса, «Свой труд», «Гур'ева»** і інш. Работа праводзіцца звеннямі на аснове індывідуальнай адзельшчыны. Якасць праполкі — ў цэнтры ўвагі камісіі па якасці. Прымаюць кожны гектар.

Арлоўскан.

ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ НА ВОРЫВА ПАПАРАЎ І ЦАЛІНЫ

Калгасы **РАГАЧОЎСКАЙ МТС** уступілі ў другі этап барацьбы за ўраджай. Калгас **«Праўда»,** Ціхініцкага сельсовета, скончыў праполку азімай пшаніцы і пераключыўся на ворыва папараў. Узарана больш 20 гектараў. Калгас рыхтуецца да сенаўборкі. Правяраюцца косы, рамантуюцца сенакасілкі і граблі. Калгас **«Новае жыццё»,** Запольскага сельсовета, прапалоў 10 гектараў пшаніцы і распачаў ворыва папару.

У калгасе **імя Фрунзе** закончана праполка азімай пшаніцы. На праполку мабілізаваны ўсе калгаснікі, якія разбіты на 6 звенняў. Калгас закончыў ворыва цаліны на плошчы ў 25 гектараў і засеяў звыш плана 18 гектараў розных культур (БЕЛТА).

ДЫРЭКТАР ЗАСУМАВАЎ...

КРЫЧАЎ (Карэспандэнт «Звязды»).

За ганебныя тэмпы сяўбы **Крычаўскі** раён занесен на чорную дошку. Але гэта зусім не турбуе дырэкцыю МТС.

— Што нам да раёна,—заяўляе дырэктар Алхімаў,—свой план ворыва мы выканаем...

МТС сваю ролю разумее так: прыехала, скажам трактарная брыгада ў калгас, узарала, што належыць па дагавору, а далей: хочаце—сейце, хочаце—не, наша хата з краю...

Тое, што калгасы зоны дзейнасці МТС на 5 мая засеялі з 8.324 га толькі 3.608 (43,8 проц. плана), Алхімава мала турбуе. Ён задаволен тым, што трактары ўзаралі ўжо 1.224 гектары (план каля 2.000 гектараў). У самы разгар сяўбы, калі трэба працаваць і дзень і ноч, каб знясць раён з чорнай дошкі, калі ўвесь трактарны парк стаяў з-за адсутнасці гаручага, Алхімаў кінуў МТС і паехаў у Ленінград за...песнямі. Ці, як гавораць работнікі, за нейкімі трактарнымі часткамі. У сапраўднасці-ж Алхімаў засумаваў у Крычаве і паехаў асвяжыцца дамоў у Ленінград.

Прыблізна да 20 красав'ка трактары не працавалі, бо была газа і не было бензіну. А з 6 мая атрымалася наадварот. Усе трактары зноў спыніліся, бо ёсць бензін, але няма газы.

Далей. У самую гарачую пару рамонту прычэпнага інвентара і трактараў Алхімаў быў у водпуску. Не можа-ж ён адказваць зараз за тое, што ў поле трактары выйшлі няспраўнымі. Трактары № 4 і № 5 «Ф. П.» два тыдні паўторна рамантаваліся ў полі. Рамантаваўся ў полі і прычэпны інвентар. Плуг у трактара № 4 «ФП» аказаўся непрыгодным для ворыва. У трактарах сістэматычна выплаўляюцца падшыпнікі. Адрамантаваныя дыскі ўсю вясну стаяць на дварэ МТС. Глеба не дыскуецца, а барануецца. Работа трактарных брыгад не арганізавана. Часта трактар прыязджае ў калгас араць, а калгас ужо даўно сам узараў.

Гаручае МТС атрымлівае з нафтасклада райсаюза. Старшыня райсаюза Іваноў увесь час запэўніваў МТС: газы хопіць, будзьце спакойны. І ў МТС не турбаваліся да 4 мая, калі Іваноў паведаміў, што на нафтаскладзе асталося толькі 6 літраў газы.

Палящелі тэлеграмы: «Трактары спыніліся, ратуйце, прапалі». А хіба нельга было ўнікнуць у самы разгар сяўбы прастою трактараў? Бясспрэчна, можна было, калі-б Алхімаў і Іваноў паклапаціліся загадзя аб завозе гаручага, дабіліся дакладнага ўліку выдаткавання гаручага кожным трактарыстам, прэміраваўшы трактарыстаў, якія эканомяць газу.

Ёсць такія трактарысты як **Давыдаў** (брыгада №4), які спаліў 2 бочкі газы, каб заскародзіць 2 гектары ворыва. Многа гаручага перавыдаткоўваюць трактарысты Чукулаеў, Кісялёў і інш.

У МТС зараз прыбыло паведамленне з сектара паліва Наркамзема аб тым, што Крычаву адпушчана 10 тон газы з аршанскага нафтасклада і 8 тон з клімавіцкага. У МТС не прыдумаюць як даставіць зараз гаручае. Машыны няма. Дырэктар—у Ленінградзе. А тут, як на зло, з кожным днём гарачэй прыпякае сонца.

М. ВІШНЕЎСКІ.

Усебеларуская канферэнцыя значкістаў „ЗОТ" лёгкай прамысловасці

ПЕРШАЙ УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ ТЭХВУЧОБЫ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Совет Народных Камісараў Беларусі горача вітае дэлегатаў першай усебеларускай канферэнцыі ўдарнікаў тэхвучобы лёгкай прамысловасці.

Другая пяцігодка ставіць перад прамысловасцю цэлы рад вельмі складаных задач, адна з іх—аўладанне тэхнікай сваёй вытворчасці, без чаго немагчыма асваенне новых прадпрыемстваў, заводаў, фабрык, пабудаваных намі ў першай пяцігодцы. Вы, дэлегаты канферэнцыі, ужо маеце дасягненні ў гэтай галіне. Ваша канферэнцыя павінна паставіць перад сабой задачу, каб у тэхвучобу была ўцягнута максімальная колькасць рабочых, тым самым вы будзеце весці барацьбу за паляпшэнне якасці прадукцыі і позунг правадыра нашай партыі таварыша Сталіна «Зь аўладанне тэхнікай на ўсіх участках соцбудаўніцтва» будзе вамі выкананы.

Няхай жывуць лепшыя ўдарнікі тэхвучобы лёгкай прамысловасці

Старшыня Соўнаркома БССР ГАЛАДЗЕД.

Лепшым перадавікам вытворчасці

Прывітанне ЦСПСБ

Цэнтральны Совет профсаюзаў БССР шле гарачае большэвіцкае прывітанне лепшым перадавікам вытворчасці—удзельнікам усебеларускай канферэнцыі ўдарнікаў тэхвучобы (значкістаў «ЗОТ») лёгкай прамысловасці.

Другая пяцігодка—пяцігодка пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства — патрабуе ад профсаюзаў і ўсяго рабочага класа яшчэ большага напружання ўсіх сіл і сродкаў краіны на выкананне народна-гаспадарчага плана, ажыццяўленне сусветна-гістарычных задач, пастаўленых XVII з'ездам ВКП(б).

Рашаючым звяном другой пяцігодкі з'яўляецца асваенне новай тэхнікі. Выкананне праграмы завяршэння тэхнічнай рэканструкцыі можа быць па-баявому ажыццёўлена пры ўмове ўдзелу ў гэтай справе шматмільённых працоўных мас. Аўладанне тэхнікай лёгкай прамысловасці з'яўляецца галоўнай велізарнай важнасці, паколькі работа гэтай галіны народнай гаспадаркі рашае задачу павелічэння вырабу тавараў шырокапажыву ў 2-3 разы — задачу далейшага палепшання добрабыту рабочага класа і калгаснікаў. Лёгкая прамысловасць БССР павінна дабівацца новых перамог у выкананні праграмы другой пяцігодкі.

Усебеларуская канферэнцыя ўдарнікаў тэхвучобы, узброіўшыся ўказаннямі правадыра нашай партыі і рабочага класа таварыша **Сталіна,** ускрыўшы на аснове большэвіцкай самакрытыкі недахопы работы профсаюзаў у разгортванні новай формы соцспаборніцтва—грамадска-тэхнічных экзаменаў,—вызначыць канкрэтную праграму далейшай барацьбы за выкананне і перавыкананне колькасных і якасных паказальнікаў лёгкай прамысловасці, за выпуск танных і добраякасных прадукцыі.

За ажыццяўленне рашаючых задач другой пяцігодкі, за завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі краіны Советаў, за палепшанне матэрыяльна-бытавога становішча рабочых і калгаснікаў, за пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства!

ЦСПСБ.

Узмацніць матэрыяльную базу тэхпрапаганды

ВІЦЕБСК, 12. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»).

Раніцнае пасяджэнне ўсебеларускай канферэнцыі «ЗОТ» 11 мая адкрылася судакладам сакратара віцебскай комсамольскай арганізацыі тав. **Рагожкіна,** які расказаў аб рабоце, праведзенай віцебскім комсамолам у галіне барацьбы за аўладанне новай тэхнікай, за правядзенне соцтэхэкзамена.

Па дакладу тав. Балціна і судакладу тав. Рагожкіна ў спрэчках выступілі тт. **Пярэчынскі** (завод «Большэвік»), **Саланоўскі** (гарбарня імя Сталіна), **Шыф** (Бярэзінскі камбінат), **Элькіна** (фабрыка «КІМ»), **Волк'нд** (Палеструк), **Турэцкі** (фабрыка «Окцябр»), **Коцік** (фабрыка «Х Окцябр») і інш.

З цікавай прамовай выступіла дырэктар фабрыкі **імя Клары Цэткін тав. Ханіна.** Яна паведаміла, што на фабрыцы раней існавала такая думка, што тэхвучобай павінны займацца хто ўгодна, але толькі не кіраўніцтва прадпрыемства. Калі было пастаўлена пытанне такім чынам, што начальнікі цэхаў, брыгадзіры адказваюць за правядзенне тэхвучобы, справа рушылася ўперад. Дзякуючы таму, што гаспадарнікі на фабрыцы заняліся ўкараненнем тэхмінімума і правядзеннем соцтэхэкзамена, прад прыемства дабілася поўных поспехаў у барацьбе за аўладанне тэхнікай і выкананне промфінплана.

Ва ўсіх выступленнях падкрэслена неабходнасць узмацнення адказнасці адміністратыўна-гаспадарчага персанала, профсаюзаў і комсамола за правядзенне тэхвучобы. Слабасць, а часамі адсутнасць матэрыяльнай базы тэхпрапаганды тармозіць далейшае паспяховае разгортванне тэхнічнай вучобы.

У радзе выступленняў віталася высунутая ў перадавой «Звязды» прапанова аб стварэнні ўсебеларускага тэхнічнага музея.

З вялікай прамовай выступіў прадстаўнік таварыства «ЗОТ» Заходняй вобласці тав. **Ларыонін.**

Другая палова дня была прысвечана рабоце секцый. Зотаўцамі на секцыях унесен рад каштоўных прапаноў. Дэлегацыя фабрыкі імя Клары Цэткін узяла шэфства над гомельскай панчошнай фабрыкай імя 8 сакавіка. У парадку со-

Выдатніца тав. ФАЙБІШ—прафарганізатар брыгады (завод Большэвік).

цыялістычнай узаемадапамогі фабрыка імя Клары Цэткін пасылае ў Гомель брыгаду ў складзе лепшых зотаўцаў і майстроў для дапамогі ў арганізацыі тэхнічнай вучобы. Фабрыка імя Цэткін выклікала па следаваць яе прыкладу фабрыкі «КІМ» і «Дзвіну».

Газета «Зотавец», якая выпускаецца на канферэнцыі рэдакцыямі газет «Звязда», «Віцебскі пролетарый», «Рабочий», «Чырвоная змена» і «Лёгкая индустрия», арганізавала на сваіх старонках заочнае выступленне дэлегатаў па дакладу тав. Балціна.

***

У пачатку ранішняга пасяджэння ўсебеларускай канферэнцыі зотаўцаў пасланы прывітальныя тэлеграмы рэдакцыям газет «ЗВЯЗДА», «РАБОЧИЙ», «ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА», «ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ», пасля чаго з вялікай прамовай выступіў загадчык прамыслова-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б т. ГОТФРЫД. Даючы ацэнку работы канферэнцыі, т. Готфрыд заяўляе, што канферэнцыя не абмежавалася вузкімі пытаннямі тэхнікі, яна вырашыла ўсе баявыя пытанні лёгкай прамысловасці.

— Задача дэлегатаў-зотаўцаў заключаецца зараз у тым, каб па прыездзе дамоў давесці рашэнні канферэнцыі да шырокіх рабочых мас. Зотаўцы павінны змагацца за тое, каб у цэху ўсе рабочыя былі тэхнічна-граматнымі людзьмі, выдатнікамі. Лепшым зотаўцам, асабліва моладзі, трэба даць усе магчымасці атрымаць сярэднюю тэхнічную асвету.

Вялікую ўвагу ў сваім выступленні т. Готфрыд удзяліў пытанню актыўнага ўдзелу зотаўцаў у барацьбе за паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых. Ён гаварыў аб неабходнасці праяўляць выключную чуласць да запатрабаванняў рабочых, упарта змагацца за рэагаванне на ўсе рабочыя прапановы.

З усёй вострасцю тав. Готфрыд звярнае ўвагу на задачы далейшай барацьбы за ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ, за ЗНІЖЭННЕ САБЕКОШТУ, за АСВАЕННЕ НОВЫХ АСАРТЫМЕНТАЎ, новых ФАСОНАЎ. Гарантыяй поспехаў у гэтым з'яўляецца чоткае аператыўнае кіраўніцтва ўсімі вытворчымі звенкамі, пачынаючы ад наркамата і канчаючы цэхамі і брыгадамі, далейшая барацьба за аўладанне вышынямі тэхнікі.

У заключэнне т. Готфрыд заклікае па-баявому рэалізаваць гістарычныя рашэнні XVII з'езда партыі, каб забяспечыць канчатковую ліквідацыю прарыва ў лёгкай прамысловасці і выкананне задач, якія стаяць перад лёгкай прамысловасцю ў другім годзе другой пяцігодкі.

Пасля т. Готфрыда выступілі таварышы КУРЦІК (рэдактар «Віцебскага пролетарыя»), СОКАЛОЎ (прадстаўнік газеты «Легкая индустрия»), Хейфец («Рабочий») і адказны сакратар ЦСПСБ т. ЛІСКОВІЧ.

З заключным словам выступіў нарком лёгкай прамысловасці БССР т. БАЛЦІН, пасля чаго канферэнцыя абгаварыла вынікі работы секцый.

Канферэнцыя закончылася прыняццём звароту да ўсіх рабочых і інжынерна-тэхнічнага персанала лёгкай прамысловасці.

ГЛЕЗЕР, ЗАРУБЕЖНЫ, МЯДВЕДЗЕЎ

НА ЗЛЁЦЕ ЗНАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ БАРЫСАЎШЧЫНЫ

Клуб хімікаў.

У вале, фае—усюды людзі. Яны апрануты па-святочнаму. У новых гарнітурах, блузах, чаравіках. Густы загар афарбаваў іх твары ў прыгожы бронзавы колер. Гэта лепшыя ўдарнікі перадавога ў рэспубліцы Барысаўскага раёна, знатныя людзі большэвіцкіх калгасаў. Іх 450 чалавек. Сабраліся яны сюды для таго, каб падвесці вынікі большэвіцкім справам, каб агульнымі сіламі намеціць шлях далейшай барацьбы за высокі социялістычны ўраджай.

Напярэдадні—праполка, ворыва папараў, асваенне новых зямель, уборка, здача прадукцыі дзяржаве — вялікія задачы, ад вырашэння якіх залежыць ажыццяўленне лозунга правадыра партыі тав. **Сталіна** — «зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі».

Імя **Евы Дубень**, 60-гадовай ударніцы, добра вядома ўсёй Барысаўшчыне. І калі нач. палітаддзела МТС тав. Сідкоў даў слова Еве, зала зашумела доўга несціхаючымі апладысментамі.

Ева смела ўзышла на трыбуну, акінула прысутных ласкавым поглядам...

— Вітаю вас, мае ўдарнікі, ад пашага перадавога калгаса «Ўдарнік». І скажу я вам яшчэ, што мы сёлета правялі веснавую сяўбу па-ўдарнаму, адсеяліся да 1 мая. Нашы жанчыны, каб не адставаць ад мужчын, каб лепш працаваць на полі, добра арганізавалі грамадскае харчаванне. Нашы калгаснікі елі ўволю і працавалі ў ахвоту. А яшчэ мы падняслі і засялі вялікі кавалак цаліны. Добры будзе авёс. Заўтра выходзім палоць пшаніцу і лён. Жанчыны нашы не сядзяць зараз без работы, а карчуюць ляды.

Еву змяніў вядомы ў раёне інспектар па якасці **Байлук Сцяпан**. Ён дакладнае злёту аб тым, што ўсходы яравых вельмі добрыя не толькі ў яго калгасе **«Новае мыцё»**, але і ва ўсіх тых калгасах, у якіх яму прышлося правяраць якасць сяўбы.

Байлук стары інспектар. За строгасць яго ў жарт празвалі «суровы дзядзька».

Пасля Герасім з калгаса «Паліт-аддзелец» расказаў злёту, як яны ачышчаюць «глебу перааралі, прадскавалі, забаранавалі і засеялі па-большэвіцку». Як яны змагаюцца ў другім этапе барацьбы за высокі ўраджай. Брыгада зараз вядзе праполку яравых, заканчвае ворыва папару. Спецыяльнае звяно ўвесь час занята на раскарчоўцы ляды пад засеў азімых культур.

Шмат яшчэ аб чым гаварылі ўдарнікі. Але тэма ва ўсіх была адна—якім метадам яны дабіліся поспехаў па пасеўнай і як ідзе перакідванне на другі этап барацьбы за высокі ўраджай.

У работах злёта прынялі ўдзел нам. старшыні СНК тав. **Саак'ян**, народны камісар земляробства тав. **Бенек** і начальнік палітсектара Наркамзема тав. **Ратнек**.

Тав. Саак'ян ад імя ўрада БССР павіншаваў калгаснікаў з вялікай перамогай. Перадаючы прывітанне ад ЦК КП(б)Б, тав. Ратнек выказаў надзею, што Барысаўшчына не здасць пяршынства ў справе праполкі і ўздыму цаліны. Тав. Бенек завастрыў увагу калгаснікаў на неабходнасць барацьбы за шырокае разгортванне жывёлагадоўлі, за паляпшэнне якасці каня.

Злёт прывіталі рабочыя барысаўскіх прадпрыемстваў—«Чырвоная Бярэзіна», імя Домбаля, «Комінтэрн».

Ударнікі ад імя ўсіх калгасаў Барысаўшчыны далі большэвіцкае абяцанне:

Да 25 мая ўзняць усе папары ў колькасці 4.200 гектараў; ворыва правесці на глыбіню 15 сантыметраў з наслядоўным баранаваннем у 2-3 сляды. На працягу лета правесці трохразовую культывацыю папараў і дваенне не пазней 15 дзён да пачатку сяўбы азімых. Правесці ворыва і культывацыю занятых папараў на плошчы 14.000 гектараў. Да 1 чэрвеня ўзняць 1.000 гектараў цаліны.

Правесці двухразовую праполку ўсіх яравых і гародніх культур на плошчы 16.400 гектараў. Абавязкова прапалоць усю азімую пшаніцу і засмечаныя ўчасткі азімага жыта.

Не пазней 20 мая арганізаваць масавую праверку гатоўнасці калгасаў да ўборкі, а 1 ліпеня правесці пробныя выязды.

Убраць у тэрмін, устаноўлены партыяй і ўрадам, ураджай з плошчы 53.300 гектараў. Уборку пачаць не чакаючы агульнага высявання пасеваў, арганізоўваючы гэту работу па меры высявання асобных участкаў. Устанавіць паўсямеснае і абавязковае згрэбанне і збіранне каласоў, абкошванне вуглоў і прымяненне верыяўлавіцеляў. На шосты дзень ад пачатку ўборкі распачаць масавую малацьбу, з тым, каб з першага снапа ўраджай адправіць на склады дзяржаве.

П. ЧЫКУН.

ЧАКАЮЦЬ ЗВОДКІ...

ЛЕПЕЛЬ (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Сказаць, што у Лепелі неаператы́ўна кіруюць сяўбой, нельга. Райком, РВК і палітаддзел МТС штодня шлюць тэлеграмы ў сельсоветы—то пасеўныя, то молніі і інш. Адна другую паўтарае.

30 красавіка РВК, РК і палітаддзел пасылаюць пасеўную тэлеграму, у якой загадваюць закончыць пасеў аўса і ільну за адзін дзень. Недасеяна яшчэ 80 проц. ільну і 50 проц. аўса.

4 мая РК, РВК і палітаддзел зноў пасылаюць тэлеграму сельсоветам і не простую, а молнію: «усім, усім, усім». Зноў прапануюцца закончыць сяўбу зернавых і ільну за адзін дзень.

Пасля тэлеграмы супакойваюцца, чакаюць зводку.

Зводка павінна даць вялікі скачок—так лічыць кіраўніцтва раёна, але зводка ашукала надзеі. Замест прыросту тэмпаў пяцідзённка дае зніжэнне на 4,1 проц. Гэта, аднак, вельмі мала турбуе раённае кіраўніцтва—раз засеяна 46,5 проц.—на 30 проц. больш, чым у мінулым годзе, значыць справа «не дрэнная».

Некаторыя сельскія работнікі, як старшыня Красналужскага сельсавета **Бадроў**, Молахаўскага сельсавета **Хамішнікаў**, Круткоўскага, **Кашко** лічаць, што наогул няма чаго спяшыць з сяўбой. У мінулым-жа годзе і гэтага не было засеяна.

Да 8 мая ў райкоме, РВК сядзелі і гадалі, які будзе ўсебаларускі процант, 8-га, калі ў раёне даведаліся, што БССР выканала план на 59,5 проц., машынка РВК адстукала чарговую тэлеграму—аб сканчэнні сяўбы к 10 мая. Аднак, у гэтай тэлеграме не сказана канкрэтна, што і як трэба зрабіць, каб закончыць сяўбу. Замест гэтага прапануецца наладзіць улік такім чынам, каб закончыць. Гэта значыць, што РК і РВК даздаюць сельсоветам даваць дутыя весткі.

Зараз у раёне сядзяць і чакаюць новай зводкі. Сакратар райкома **Хіжынкоў**, старшыня РВК **Закеркін** лічаць, што гэта пяцідзённка павінна даць 25 проц. прыросту. Аднак, ход сяўбы за апошнія дні гаворыць аб адваротным. Між тым Лепель мае ўсе ўмовы для таго, каб быць перадавым. Перад самай сяўбой раён атрымаў новую МТС—15 трактароў ХТЗ у дадатак да старых 10 трактароў «Фардзон-путілавец» і 3 «інтэраў». Раён атрымаў таксама немалую насенную пазыку. Але усё-ж ён адстае. Адстае раён толькі таму, што жывое аператы́ўнае кіраўніцтва сельсоветамі і калгасамі заменена тэлеграмамі, молніямі: «усім, усім, усім».

Н. Д.

ДЭКАДНІК БОЛЬШЭВІЦКАГА ДРУКУ

АРГАНІЗАВАНА, ВЕСЕЛА І КУЛЬТУРНА

Партарганізацыя і заўком завода імя Варашылава з першых-жа дзён дэкадніка друку разгарнулі палітычна-масавую работу ў цэхах і брыгадах.

Уся гэта работа праходзіла пры шырокім і актыўным удзеле рабкораў і ўсіх рабочых, работніц і спецыялістаў завода.

Адным з такіх масавых мерапрыемстваў з'яўляецца агульна-заводская канферэнцыя, прысвечаная дэкадніку друку, якая праведзена 11 мая.

Ва ўпрыгожанай залі клуба металістаў у гэты дзень сабралася некалькі сот рабочых завода. Работы канферэнцыі пачаліся ў секцыях. Удзельнікі секцыі партмасавай работы цікавяцца як «Звязда» перабудавала сваю работу на аснове рашэння XVII з'езда ВКП(б). Яны дзеляцца вопытам па рабудовы партмасавай работы ў цэхах і групах на заводзе. Уносяць свае прапановы і адзначаюць недахопы, у ходзе перабудовы як на заводзе, так і ў рабоце «Звязды».

Работа секцый: «аб чым пісаць рабселькорам» і «аб рабоце з рабселькорамі» праходзіць не менш актыўна.

На секцыях выявіліся недахопы работы заводскай і цэнтральнай прэсы па перабудове партмасавай работы, па рабоце з рабселькорамі, іх слабая сувязь з масамі рабселькораў і нізавым друкам.

З 9 да 10 гадзін — перапынак. Загрымеў духавы аркестр, адкрыўся буфет. У залі — гульні, спевы і пляска.

У 10 гадзін зноў цішыня. Усе ўдзельнікі канферэнцыі занялі месца ў агульнай вялікай залі. Тут заслухоўваюцца кароткія інфармацыі кіраўнікоў секцый аб выніках праробленай работы, інфармацыя аб рабоце аддзела пісем рабочых і калгаснікаў рэдакцыі «Звязда», гарадскога пракурора аб сувязі пракуратуры з цэнтральным і заводскім друкам і аб рэагаванні на раб селькораўскія матэрыялы і пісьма рабочых і калгаснікаў.

І тут, як і ў секцыях, работа праходзіць жыва, дзелавіта і самакрытычна. Выяўляюцца поспехі і недахопы, уносяцца дзелавыя прапановы.

Трэба таксама адзначыць вельмі добрую арганізацыю канферэнцыі. Распарадак быў выпрацаван узорна. Добра працаваў буфет, снабжоны закускамі рознастайнага асартымента і прахладжальнымі напіткамі.

А. МАРОЗ.

НА МАСОЎЦЫ „КАМУНАРАЎЦАЎ"

11 мая па ініцыятыве шматтыражкі «Комунаравец» была арганізавана майская масоўка, прысвечаная Дню друку. У масоўцы прымалі ўдзел рабочыя кавальскага і ліцейнага цэхаў завода **«Комунар»**.

У парку культуры і адпачынку граў заводскі духавы аркестр. Рабочыя і работніцы танцавалі і на ладжвалі гульні. Рэдкалегія шматтыражкі арганізоўвала выданне насценгазеты «За работу па-новаму». Паходны рэстаран падрыхтоўваў снеданне для ўсіх удзельнікаў масоўкі. Пасля гульняў і танцаў удзельнікі маёўкі заслухалі выступленне рэктара Комуністычнага інстытута журналістыкі тав. **Чыжовай** аб рабоце замежнага друку і рабкораў. Тав. Чыжова прыводзіла характэрныя факты работы комуністычных газет «Ротэ фанэ», «Юманітэ», газет Заходняй Беларусі, Польшчы і іншых. Яна прыводзіла прыклады таго, як нападае комуністычнае слова ў гушчу рабочых, як умела і арганізавана распаўсюджваюцца выданні, якія творацца ў падпольных комуністычных друкарнях.

—Рабочыя шукаюць праўды,—гаворыць Чыжова, — і яе знаходзяць толькі на старонках комуністычнага друку. Тав. Чыжова звярнула ўвагу рабкораў і рабочых на неабходнасць яшчэ лепш паставіць барацьбу нізавых газет і рабкораў завода за колькаснае і якаснае выкананне промфінплана, за выкананне рашэнняў XVII партыйнага з'езда.

Гульні прадаўжаліся. Тт. Цішкевіч, Скіпер, Чэрняк, Сагаловіч і Айзенштадт выступілі з цікавым нумарам — музычнай газетай.

У газеце ілюстраваліся факты дрэннай барацьбы за якасць прадукцыі, бічаваліся лодыры і гультаі. Нумар праходзіў весела, жыва і едка бічаваліся недахопы.

Апрача музычнай газеты была выпушчана таксама радыё-газета. Масоўка заканчвалася самадзейным канцэртам.

На масоўцы аб Дні друку, якая ўпершыню праводзілася заводам «Комунар», была падагулена работа першых дзён дэкадніка друку ў кавальскім і ліцейным цэхах і вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацаванню нізавога друку і рабкораў і кіраўніцтва імі.

17-га мая будзе праведзена масоўка ўсіх рабочых завода «Комунар».

Р. С.

ЗА АСВАЕННЕ НОВЫХ ВІДАЎ ПРАДУКЦЫІ!

На аснове рашэнняў XVII з'езда асваення раду варштатаў, да асваення раду варштатаў, якія раней увозіліся з Германіі.

У 1934 г. завод павінен асвоіць два тыпы варштатаў сістэмы «Калава» для абточкі валаў — абдзірачны і шліфавальны. Варштаты на сваёй канструкцыі вельмі складаныя, маюць да 300 розных частак, якія патрабуюць вялікай дакладнасці пры апрацоўцы.

Улічваючы сур'ёзнасць і важнасць справы, заводскі друк узяў гэты ўчастак работы пад асобы нагляд.

Была склікана шырокая нарада рабкораўскага актыва, дзе з кожным намячаецца план дзеяння. Рабкорам мадэльнага цэха і ліцейшчыкам даецца заданне сачыць за своечасовай адліўкай і якасцю адліваемых дэталяў. Рабкорам аддзела механікі даецца заданне дабіцца своечасовага выпуску вымяральных і рэжучых інструментаў, рабкорам механічнага цэха — узяць пад нагляд выраб дробных частак і пераход на зборку па вузлах. У рэзультаце шматтыражка мае рад пастоў па ўсіх участках работы, што дае магчымасць своечасова сігналізаваць аб недахопах і дапамагчы больш паспяховаму прасоўванню работы.

25 лютага «Чырвоная вагранка» па сігналу рабкора Казачэнка четвертае, што ў мадэльным цэху слаба пастаўлен тэхнакантроль за прыёмкай гатовых мадэляў. Газета дабілася знішчэння гэтага недахопу. Ні адна мадэль без тэхкантролю не перадаецца ў ліцейную. У рэзультаце першая станіна адліваецца ізотаўцамі Ярумскім і Васільевым раней тэрміну. Якасць адліўкі вельмі высокая.

6 сакавіка пачынаюцца першыя «дзіцячыя хваробы» асваення. Некаторыя дэталі выходзяць у брак, што можа сарваць усю работу па выпуску варштата. «Чырвоная вагранка» вуснамі сваіх лепшых рабкораў-ударнікаў: токара **Рэзніка**, страгальшчыка **Аграната** і іншых ставіць пытанне аб неабходнасці замацаваць на рабоце па выпуску варштата паўную колькасць высокакваліфікаваных рабочых і выробляць дэталі па-за ўсякай чаргі. Вылучаецца група старых кадравых кваліфікаваных рабочых тт. **Верашчага, Павалсцкі, Лукомскі, Жыгалкін, Шустаў, Блюмкін** і інш., якія фарсуюць работу па абточцы станіны і зборцы вузлоў.

Але тармозяць работу няўвязкі ў планаванні. «Чырвоная вагранка» дабіваецца выпрацоўкі цвёрдага графіка, які ўносіць парадак у далейшую работу. Работа пачынае ўваходзіць у нармальную каляіну.

Мала сабраць першы варштат, трэба вывучыць тэхніку яго работы, ведаць тэхналагічны працэс яго вузлоў, каб змагчы хутка перайсці на масавы серыйны выпуск. «Чырвоная вагранка» дабіваецца стварэння кароткатэрміновых курсаў па аўладанню тэхнікай варштата. Курсы праведзены. Ставіцца пытанне аб азнаямленні ўсіх рабочых цэхаў, звязаных з выпускам варштата, з яго чарцяжамі і работай. Цяпер арганізуецца гурток павышанага тыпу, робяцца чарцяжы з радам дэталяў у разрэзе для развешвання па цэхах. Пры «Чырвонай ваграцы» будзе выдавацца спецыяльны бюлетэнь з папулярнымі матэрыяламі па тэхніцы асваення варштата.

У апошнія дні, напярэдадні 1 мая, атрымалася затрымка на зборцы: не хапае слесароў. «Чырвоная вагранка» папулярызуе ідэю парткома, што «кожны адказны работнік-слесар павінен адпрацаваць па некалькі змен на вузлах». Выпускаецца спецыяльны бюлетэнь-маланка. Тры лепшых слесары — старшыня заўкома Паўловіч, загадчык кантрольным аддзелам Ляпман і начальнік арматурнага цэха Шклявер выходзяць па вечарах працаваць на зборцы вузлоў.

Так «Чырвоная вагранка» з нумара ў нумар сумесна з цэхавым і брыгадным друкам змагаецца за асваенне выпуску варштата «Калава». У механічным цэху стаіць сабраны, але яшчэ не апрабаваны першы варштат. Гэта пробны варштат. Апрабаваўшы варштат і выявіўшы магчымыя дэфекты ў выробе яго, завод павінен разгарнуць масавы выпуск высокакласных варштатаў. За выкананне гэтай задачы шматтыражка і рабкоры завода будуць змагацца з усёй большэвіцкай упартасцю.

ПЛОТКІН.

Рэдактар шматтыражкі «Чырвоная вагранка», Віцебск.

АБ ХОДЗЕ КАМПАНІІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ Ў ГАРАДОЦКІМ РАЕНЕ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

1. Адзначыць, што Гарадоцкі РК КП(б)Б (сакратар т. КАНАВАЛАЎ) недаацаніў палітычнай важнасці і недаацаніў палітычнай важнасці і значэння кампаніі рэалізацыі пазыкі. РК не забяспечыў падрыхтоўчай работы да рэалізацыі пазыкі, не праверыў ступень падрыхтаванасці да гэтай работы фінансавага апарата, у гэтай работы фінансавага апарата, у прыватнасці, райашчадкасы, усугубіўшы гэтае становішча і тым, што з дня апублікавання закона кіраўнікі райфа і райкасы былі прымацаваны да сельсавета, і гэта з самага пачатку разгортвання кампаніі адмоўна адбілася на тэмпах і якасці работы па размяшчэнню пазыкі (на 26 красавіка рэалізавана толькі 37,3 проц. плана, у тым ліку сярод калгаснікаў 16,9 проц., а па аднаасобнаму сектару нават не была яшчэ распачата работа).

2. ЦК КП(б)Б лічыць зусім нецярпімым і злачынным такое становішча, што яшчэ і да гэтага часу па раёну не раздана на 146 тыс. руб. аплачаных аблігацый пазыкі першага выпуску, а па лініі райпракуратуры (пракурор тав. ДЫБЧА) канкрэтныя віноўнікі ў затрыманні выдачы аблігацый (кіраўнік ашчадкасы т. КОЛХАЎ) і расходванні адлічэнняў на пагашэнне пазыкі, а ў паасобных выпадках у прысваенні гэтых сум — не прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Пад асабістую адказнасць сакратара РК т. Канавалава і райкамсода—т. Сурба забяспечыць бездакладную раздачу падпісчыкам аплачаных аблігацый, прымаючы меры да таго, каб астаўшаяся запазычанасць па ўзносах па пазыцы першага выпуску была пагашана пры выдачы аблігацый.

2. Абавязаць НКЮ т. Кузьміна віноватых у несвоечасовай раздачы аблігацый першага выпуску, а таксама і канкрэтных віноўнікаў у расходванні адлічэнняў на пагашэнне пазыкі на другія мэты, у прысваенні гэтых сум—прыцягнуць да крымінальнай адказнасці, надаўшы гэтай справе палітычнае значэнне.

3. Райпракурору т. Дыбча, які рас палагаў канкрэтным і праверанымі матэрыялам і на канкрэтных віноўнікаў у прысваенні і расходванні на другія мэты грошай, сабраных ад падпісчыкаў на пазыку (справа арцелі металістаў—старшыня Брэлаў, справа нестаўніцы Грыгапавай, справа калгаса імя Вападарскага, Пальмін. сельсавета, справа Альшэўскага—тэхніка Хвішнянскага ільназавода, справа арцелі транспартнікаў, справа езеранскага сельпо і інш.), але не прыцягнуў ні аднаго з гэтых віноўнікаў да адказнасці, — абвясціць суровую вымову.

4. У сувязі з тым, што падобныя факты нераздачы аблігацый маюць месца і ў радзе іншых раёнаў, у прыватнасці, Талачынскім, Крупскім, ЦК папярэдзіць сакратароў РК, што калі ў самы бліжэйшы тэрмін гэтыя скажэнні не будуць выпраўлены, вінаватыя будуць прыцягнуты да жорсткай адказнасці.

5. Сакратару Гарадоцкага РК т. Канавалаву, які не змог па-большэвіцку арганізаваць работу па рэалізацыі пазыкі, не выявіў хваравітых з'яў і перашкод у разгортванні кампаніі, абвясціць вымову.

Абавязаць райкомы і РВК зараз жа пераключыцца на паспяховае завяршэнне рэалізацыі пазыкі, умела спалучаючы гэту работу з правядзеннем сяўбы. Пры размяшчэнні пазыкі мець на ўвазе адстаючы ўчастак — ахоп падпіскай за наяўны разлік па аднаасобнаму сектару, узяўшы яго пад неаслабны нагляд, і разгарнуць работу так, каб не пазней 15 мая пад пісскай былі ахоплены ўсе калгаснікі і аднаасобнікі раёна.

Абавязаць райкамсод т. Сурба, побач з правядзеннем падпіскі, арганізаваць праверку выйгрышаў на месцы ў калгасах, соўгасах і т. д., забяспечыўшы выйгрышнымі табліцамі ўсіх упаўнаважаных РВК па сельсоветах.

Абавязаць т. Хацкевіча (НКФ) даць указанні раёнам, што збіраць грошы па падпісцы на пазыку маюць права толькі асобы, спецыяльна на гэта ўпаўнаважаныя, устанавіўшы справаздачнасць за іх і кантроль за своечасовым паступленнем.

МІНА АДНААСОБНІКА

СТАРЫЯ ДАРОГІ.

Стара-дарожскія раённыя арганізацыі яўна ігнаруюць аднаасобніка ў рэалізацыі новай пазыкі. За ўвесь час сярод аднаасобнікаў размешчана аблігацый толькі на 2 тыс. руб.

У паасобных сельсоветах падпіска яўна зрываецца як па калгасах, так і па аднаасобнаму сектару. Прыкладам можа служыць **Горкаўскі** сельсовет (старшыня **Паляшчук**), які пры заданні ў 36.650 руб. рэалізаваў пазыкі толькі на 11.580 руб. Сярод аднаасобнікаў сельсовета падпіска дагэтуль яшчэ зусім не разгорнута, **не прадана ні адной аблігацыі.**

Не лепш за Горкаўскі працуе і **Дзяжнянскі** сельсовет (старшыня **Грань**). Нагодзе плана тут трэба рэалізаваць пазыкі на 37.650 р., рэалізавана-ж усяго на 8.685 р. Сярод аднаасобнікаў размешчана аблігацый на... 120 руб.

У гэтых сельсоветах аднаасобнікаў проста скіпулі з рахунку. «Зараз праходзіць сяўба, рэалізацыяй пазыкі няма часу займацца» — так апраўдваюцца кіраўнікі сельсоветаў.

Чаго варты такія, з дазволу сказаць, апраўданні, не прыходзіцца даказваць. Гэта-ж факт, што тыя сельсоветы, якія здолелі па-большэвіцку спалучыць рэалізацыю пазыкі з паспяховым правядзеннем сяўбы, дабіліся значных поспехаў. Напрыклад, Стара-дарожскі местачковы совет (старшыня тав. **Аліеўскі**) поўнасцю выканаў кантрольнае заданне па размяшчэнню пазыкі.

Ш. ЛІСТАПАДАЎ.

ВОПЫТ ПЕРАДАВІКА

СЯННО. (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

Будскі сельсовет (старшыня —**Цуранаў**, упаўнаважаны РК — **Шурмелеў**) выканаў заданне па рэалізацыі пазыкі на 106 проц. Метады работы гэтага сельсовета заслугоўваюць быць адзначанымі.

У кожным калгасе, вёсцы праводзіліся **выязныя пасяджэнні** прэзідыума сельсовета пры шырокім удзеле калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. На пасяджэннях абгаварвалася пытанне аб становішчы і задачах рэалізацыі пазыкі.

Вялікі эфект дала праведзеная грамадская праверка, як падпісаўся на пазыку сам актыў сельсовета—старшыні калгасаў, брыгадзіры, упаўнаважаныя дзесяцідворак.

Падпіска сярод калгаснікаў праходзіла непасрэдна ў брыгадах, сярод аднаасобнікаў—шляхам пад ворнага абходу. Уся работа была прасякнута метадамі социялістычнага спаборніцтва.

Вопыт Будскага сельсовета перапосіцца зараз у іншыя сельсоветы раёна.

АРЛОЎСКАЯ.

М. РАБІЭРІЧ

ШАФЫ З „КАПРЫЗАМІ"

Для Івана Фёдаравіча, рабочага-ўдарніка мясцкага чыгуначнага вузла настала доўгачаканая пара. З ёю Івана Фёдаравіча было шмат чаго звязана. Што можа быць, зразумела, апрача работы, лепш за свет чыстай, чыстай і добра абсталяванай кватэры. Тут табе і сталовая, і спальня, і дзіцячы пакой, і кухня, цёмі нават ванная. Больш таго, нават фадаправод на кухні. Трэба вядро вады—адкруціў кран, наліў. Мала вядра, наліваў два, тры, пяць. Не трэба, як раней, хадзіць змаль за паўкілометра, ды яшчэ ў чарзе стаяць там.

І ўсё-ж, не гледзячы на гэта, Іван Фёдаравіч адчуваў, што ў новай кватэры чагосці не хапае: мэбелі аказалася небагата. Залежала гэта не ад таго, што ў Івана Фёдаравіча не было грошай для набыцця мэблі, а ад таго, што ў ранейшай кватэры яе не было дзе паставіць.

Цяпер-жа, пасля пераезду на новую кватэру востра паўстала пытанне аб мэблі. Невялікая бяда. Такую кватэру куды цяжэй набыць—і то атрымаў, а за мэбляй справа не стане.

Не адкладваючы, як кажуць, справы ў доўгі яшчык, Іван Фёдаравіч рашыў на другі-ж дзень пасля паваселля адправіцца за мэбляй.

Але не такой лёгкай аказалася вырашэнне гэтай «праблемы». З першага-ж кроку—няўдача. Самы бліжэйшы мэблевы магазін быў на адлегласці каля двух кілометраў.

— Чаго-ж гэта яго забрала так далёка, як на пляц Волі,—падумаў Іван Фёдаравіч.—Відавочна для таго, каб лепш абслугоўваць спажыўцоў, кааператары ўсе мэблевыя магазіны сканцэнтравалі тут. Магчыма так і сапраўды лепш. Праўда, хадзіць вельмі далёка, асабліва з акраін, але-ж затое калі прыдзеш на пляц, тут усё знойдзеш. Вось мэблевыя магазіны 95 і 105 горрабкопа. Не знойдзеш што патрэбна ў гэтых магазінах, побач магазін ЗРК завода імя Варашылава. Не мадабалася ў гэтым магазіне, пераходзь праз адну сцену, там новы магазін Менгандлю. Адным словам, усё к твайм паслугам—вынес заключэнне Іван Фёдаравіч. І з гэтым заключэннем накіраваўся ў мэблевы магазін № 105.

Першае, што кінулася яму ў вочы, гэта крэслы. Ля стала стаялі два крэслы вырабу саматужна-прамысловай арцелі «Дрэваапрацоўшчык».

«Не крэслы, а проста цацкі»,—падумаў ён і тут-жа папрасіў даволіць выбраць штук 6 крэслаў.

— Калі ласка,—адказаў загадчык **Лупач**,—вось выбірайце колькі патрэбна.

Па фасону і па цане ўсе крэслы, якія знаходзіліся ў магазіне былі падобны да тых, якія стаялі ля стала, але па якасці зусім іншыя. У аднаго ножка карацейшая, у другога шчыліны замазаны кітам і запаліраваны лакам, які бярэцца за адзежу і пакідае плямы, у трэцяга—не ўклеена фанернае сядзенне, у чацвертага не моцна прывінчаны ніжні абручок, пяты проста дрэнна склеен, калі да яго дакранешся, хістаецца і скрыпіць, як нямазаныя калёсы.

Перабраўшы так дзесяткаў пару крэслаў, Іван Фёдаравіч рашыў узяць не 6, а толькі 2. Тут-жа ён папрасіў выпісаць два крэслы, якія стаялі ля стала.

— Гэтыя крэслы не прадаюцца. Вунь, калі ласка, для продажу. Бярыце хоць 20, а гэтыя толькі для выстаўкі,—атрымаў ён вельмі выразны адказ загадчыка магазіна.

— Не прадаюцца?.. шкада. Тых я браць не буду, яны не падыходзяць. «Відаць крэслы прыдзецца ўзяць у другім магазіне, а гут толькі купілю дыван, які каштуе 200 рублёў»—падумаў Іван Фёдаравіч.

Але беглы агляд дывана прывёў да тых-жа рэзультатаў, што і агляд крэслаў. Балонкі аказаліся з гнілога матэрыяла. Верхняя паліца пасядзена чэрвяточынай, карнізы зроблены з другой пароды дрэва і дрэн на прыбіты. Галоўкі цвікоў не загнаны і не замазаны.

У іншых магазінах крэслы і дываны аказаліся такімі-ж. Капапа, якою Іван Фёдаравіч хацеў замяніць дыван, аказалася вельмі грубой аддзелкі і афарбоўкі. Больш таго, афарбоўка злазіць і адтрукоўваецца па вопратцы. У самай лепшай з усіх, якія былі ў магазіне, аказалася зламанай задняя нага. Сталоў, кухонных шафікаў, дзіцячых ложкаў у магазінах на гэты раз зусім не было.

Адно, што ўдалося ўсё-ж купіць —гэта шафу вырабу завода імя Молатава. За яе Іван Фёдаравіч заплаціў 200 рублёў. Праўда, дарагавата, але затое шафа маскоўскага фасону, з тумбамі, люстэркай і фарніраваная пад дуб.

Колер крыху не падабаўся, але што-ж рабіць, калі завод імя Молатава ўсе шафы выпускае адной афарбоўкі. «Інакш нельга, бо парушыцца паток вытворчасці. Гэта не перашкодзіць задаволенню густу спажыўца»,—заяўляюць кіраўнікі завода.

Як-бы там ні было, але каля 10 гадзін вечара шафа ўрачыста была прывезена на новую кватэру. Шафа ўсім спадабалася. На запытанне, чаму купіў толькі адну шафу, Іван Фёдаравіч лаканічна адказаў:

— Не ўсё-ж адразу. Купім і астатняе, Масква не адразу будавалася.

Доўга не разважаючы, пачалі на паўняць шафу. У першую чаргу была развешана верхняя вопратка. Варта было, аднак, папрабаваць за чыніць дзверцы, як шафа пачала выдаваць свае капрызы. Дзверка не зачынялеца--дый годзе. Прышлося зняць з края дзверцы фарніроўку.

Пры далейшым, больш дасканалым вывучэнні, выявіліся новыя капрызы: верхні яшчык для бялізны адчыняўся, а ніжні ніяк не падаецца. Нават ручка, якая па мове молатаўцаў завецца фанітурай, адарвалася. Дарэчы, фанітурай называюцца не толькі ручкі, але і замкі, ключы і інш. Аб якасці **ўсёй** фанітуры мы судзіць не бяромся, бо вытворчыя прадпрыемствы, у тым ліку і завод імя Молатава **ў** большасці яе зусім не прымацоўваюць. Яны чамусці лічаць, што гэта да якасці шафаў не адносіцца.

Магчыма, што яны маюць рацыю, бо гэта-ж факт, што ад сталоў, шафаў, буфетаў фанітура адлятае ў першы-ж дзень. Якая-ж гэта якасць: нікудышняя. Іван Фёдаравіч у гэтым ўпэўніўся на ўласным вопыце. Для таго, каб адчыніць ніжні яшчык яго прышлося вылачваць. Для таго-ж, каб гэты яшчык зноў зайшоў на сваё месца, патрабавалася, як і з дзверкі шафы, зняць фаніроўку.

Раніцой шафа паказала новыя капрызы. Па ўсёй фаніроўцы выступілі чорныя плямы. Мясцамі фаніроўка паадставала, пакаробілася і новая шафа стала падобнай да той, якую Іван Фёдаравіч пакінуў на старой кватэры, як нягоднае барахло.

Выведаўшы ўсе гэтыя прычуды і капрызы шафы, Іван Фёдаравіч задумаўся:

— Чорт вазьмі, хто-ж у гэтым вінават? Ці гэта вінаваты тыя, хто робяць такое барахло, ці тыя што прадаюць.

Вінаваты,—напэўна—і тыя і другія.

***

Але з заключэннем Івана Фёдаравіча не хочуць згадзіцца самі вінаватыя. Гэта вельмі выразна выявілася на нарадзе вытворчых і гандлюючых арганізацый, якая адбылася гэтымі днямі пры канвенцыйным бюро Наркамснаба.

Кіраўніцтва завода імя Молатава, у асобе тав. **Карасіка**, даказвала, што вінаваты гандлёвыя арганізацыі. Яны не ўмеюць хаваць мэблі. Што-ж датычыць фанітуры, то гэта, па яго думцы, наогул да якасці прадукцыі завода не адносіцца (!?).

Лев'н-жа—старшыня арцелі «Дрэваапрацоўшчык», а таксама прадстаўнік Белкаапліеса **Розман** проста заявілі:

— Што-ж, не падабаецца вам наша прадукцыя, не бярыце. Да нас кожны дзень прыязджаюць розныя кааперацыйныя камівояжоры з іншых месц Саюза, яны забяруць.

Магчыма, што і ў іншых мясцах ёсць такія-ж гора-кааператары, як і ў БССР, якія купляюць усякае барахло, толькі-б атрымаць процанты за набыты тавар.

Але ці значыць гэта, што вытворчыя арганізацыі павінны навадняць барахлом совецкі рынак, затаварваць гандлёвыя арганізацыі нікому непатрэбнымі рэчамі?..

У сувязі з аграмадным ростам матэрыяльна-бытавога становішча рабочага класа і калгаснага сялянства, надзвычай узраслі і запатрабаванні працоўнага спажыўца. За задаваленне гэтых узросшых запатрабаванняў у аднолькавай меры абавязаны змагацца і вытворчыя, і гандлёвыя арганізацыі.

Вытворчыя аб'яднанні і прадпрыемствы ў першую чаргу вінаваты ў тым, што на рынак пападае нядобраякасная прадукцыя, у тым ліку і мэбля. Але не ў меншай ступені вінаваты і работнікі гандлёвых арганізацый, па віне якіх гэта прадукцыя пападае ў крамы.

Таварышы Карасік, Левін і Розман абавязаны ведаць, што рабочы спажывец як у БССР, так і ў іншых мясцовасцях Совецкага Саюза не менш патрабавальны за Івана Фёдаравіча і што іх запатрабаванні павінны быць задаволены добраякаснай прадукцыяй.

ПЕРАВОЗЯЦЬ... ПАВЕТРА

МАГІЛЕЎ. (Ад кар. «Звязды»).

Калі команда буксірнага парахода «Правда» прапрацоўвала пастаноўку ЦК і СНК аб планаванні перавозак і паляпшэнні работы воднага транспарта, можна было пачуць заўвагі:

— Ну і правільна. Быццам спецыяльна пра магілеўскую прыстань напісана...

«... Пробег суднаў паражняком у адваротным кірунку дасягае 60 проц. ад іх гружанага пробегу»... Гэта вытрымка з пастановы ЦК і СНК поўнасцю характарызуе работу таго-ж парахода «Правда» і ряду іншых. Параход «КІМ», як павінен вазіць па лініі Магілеў—Орша пасажыраў і грузы—возіць... паветра.

— Дрэнныя справы, — гавораць воднікі, — недаацэньваюць кліенты наш транспарт...

Ці праўда гэта? Адкуль такая «недаацэнка»?

Аказваецца... «КІМ» ПАВІНЕН вазіць грузы і пасажыраў. І калі ён бярэ груз, то «не ўкладваецца» у графік раскладу, позніцца, а тымчасам пасажыры перабягаюць на чыгачныя станцыі—«усё-ж менш возіць, ды не пад адкрытым небам. Выходзіць — «КІМ»'у даводзіцца вазіць ТОЛЬКІ груз. А гэта пасажырскаму параходу невыгадна. Тады нач. Магілеўскай прыстані т. ПАДГОРНЫ, каб зноў заваяваць аўтарытэт у пасажыраў, не чакае на пагрузку, а загадвае параходу ехаць хоць без грузаў, але па раскладу. Адзін пасажыр—чалавек недаверлівы. Ён не хоча сядзець на беразе рачкі, чакаць «шчасця». Такім чынам «КІМ» бегае паражняком.

Прыходзяць на прыстань агенты з шоўкавай фабрыкі, са шкляўскай папяровай і прапануюць грузы.

— Вам куды?

— У Харкаў, Паптаву...

— Не прымаем. Можам узяць толькі да водных прыстаней: у Кіеў, у Одэсу...

І зноў кліенты вымушаны карыстацца чыгункай.

Наогул на магілеўскай прыстані няма... прыстані. Захочаш, скажам, у Быхаў паспаць груз вадою, прывязеш да ракі, а табе Падгорны ультыматум:

— Прывазіце праз пяць дзён, да наступнага рэйса...

— Дазвольце, — абураецца кліент, — навошта-ж мне вазці назад груз і зноў прывозіць? Хай лепш у вас палежыць...

— Лёгка сказаць, палежыць. А куды? Сабе пад пожак, ці што?

І сапраўды — пакгауза няма, брэзентаў няма і... вартаўнікоў няма

Гэта не ўсе недахопы магілеўскай прыстані. Параходныя каманды надзвычай безадказна адносяцца як да сваіх суднаў, так і да грузаў. Толькі за адзін красавік чатыры параходы пацярпелі 5 аварый. А воднікам —хоць-бы што. Скажам, капітан Асадчы вёў «Правду» і наехаў на пёдарэз. 16 гадзін прастаяў, шмат страт прынёс. Гэта было 7 красавіка, і дагэтуль нават не сходзе каманды пытанне не паставілі. А капітан не перастае ганарыцца:

— Я ўсё рабіў па правілу, толькі што руху вады не ўлічыў.

У прыстані зусім няма дэбаркадэра. Грузчыкі павінны па пяску, па ямах насіць угону груз. У выніку — прыбыўшае з Гомеля судно разгружаецца замест 11-12 гадзін — трое сутак.

На прыстані ёсць прыгожая чакальня для пасажыраў. Начальнік прыстані гаворыць, што яна ўчутры выфарбавана і абклеена новымі прыгожымі плакатамі. Адкуль пасажыры літаральна смажацца на сонцапёку, бо чакальня заўсёды на замку. Яна зачынена таму, што там няма сталоў і лавак... А іх няма таму, што нама грошай... А грошай нямa таму, што... і так без канца.

Не лепш адносіцца кіраўніцтва прыстані і да матросаў. З чатырох параходаў, што выйшлі на правочнае, у трох цякуць папубы, і ў дождж матроскія каюты, як пад рэшатам. Гніюць, набітыя замест стружкі саломай, матрацы. Загадчык магазіна ШКЕЛЬ выдае матросам, якія едуць у рэйс на два тыдні, толькі на адзін дзень хлеба. Вось «клопаты» магілеўскіх водных чыноўнікаў аб рабочых-транспартнікаў.

ВІТ. ДАЛЬ.

Міма асноўнай задачы

Перабудову партыйнай работы ў **Ушачах** зразумелі своеасабліва. Як толькі ліквідавалі аддзелы ў райкоме і вылучылі інструктароў, у райком пасыпаліся заяўкі.

Загадчык райза **Жукаў** звоніць:

— У мяне ў Весніцкім сельсавеце прарыў. Дайце інструктара.

Старшыня райсаюза тэрмінова запытвае:

— Куды едзе інструктар **Ліпоўская**, у мяне ёсць важнае даручэнне...

Словам інструктароў райкома асобныя комуністы, кіруючыя работнікі раённых устаноў зразумелі, як «рэзервовых людзей», якіх можна кідаць куды ўгодна і каму ўгодна.

Гэта няправільная тэндэнцыя не атрымала належнага адпору. Кіраўнікі раённых устаноў у самы гарачы час сёлбы сядзяць у сваіх габінетах, спадзяючыся, што інструктары райкома на месцы «вывезуць» за ўсіх.

А інструктары раскідваюцца ў рабоце, часта праходзячы міма **асноўнай** сваёй работы па павышэнню актыўнасці комуністаў у партыйным жыцці, іх ідэалагічнага ўзроўню і авангардная роля. Праведзеная нядаўна інструктарам ЦК тав. **Вайнштэйнам** нарада інструктароў райкома і ку ставы партсход (В-Далецкі, Весніцкі і М-Далецкі сельсоветы), паказалі, што партыйная работа не стаіць яшчэ ў цэнтры ўвагі інструктароў.

Што з'яўляецца найбольш каштоўным у рабоце інструктароў? Каштоўнае тое, што яны 75-80 проц. свайго рабочага часу знаходзяцца непасрэдна ў масах, дапамагаюць мясцовым работнікам у вырашэнні канкрэтных пытанняў, сігналізуюць райкому аб найбольш прынцыповых фактах.

Тав. Ліпоўская працуе інструктарам каля двух месяцаў. За гэты час яна вывучыла большасць комуністаў, уцягнула настаўнікаў у палітычна-масавую работу сярод калгаснікаў. Многія настаўнікі прымаюць актыўны ўдзел у выпуску калгасных і брыгадных газет, праводзяць гутаркі па бягучых пытаннях, дапамагаюць у правядзенні кампаніі па рэалізацыі пазыкі. Але ёсць і вялікія недахопы ў яе рабоце, як і ў рабоце другіх інструктароў. Калгасны актыў не выяўляецца, з ім рэдка дзе праводзіцца работа. Самі інструктары ўсяго не зробяць. Неабходна арганізаваць партыйпаў і перыядычна даваць ім інструкцыйныя ўказанні.

Партыйная вучоба ў раёне праходзіць далёка нездавальняюча. І гэтай важнейшай справе інструктары не аддаюць патрэбнай увагі. Асобныя інструктары ў гэтай справе дапусцілі памылкі. Напрыклад, тав. Ліпоўская арыентавала партыйцаў толькі на палітбаі, на адказы па пытальніку, а не на сістэма тычнае глыбокае вывучэнне пастаноў XVII з'езда партыі.

У пагоні за тэмпамі, падмяняючы сур'ёзную арганізатарскую работу кампанейскай шуміхай, інструктары Ушацкага райкома забыліся на тое, што рад партыйпаў зусім нічога не чыталі і не чытаюць аб з'ездзе. Парторг калгаса «Прагрэс» **Сцяпанаў** абмяжоўваецца толькі тым, што паслухаў на палітбаі ад казы на пытанні, а сам не працуе над вывучэннем рашэнняў з'езда. Таксама адносяцца да парт вучобы партыйцы **Фейгін, Кулякок** і інш. Аб рабоце са спачуваючымі інструктары, за выключэннем тав. **Лейман**, і не падумалі.

Не вызваліліся яшчэ асобныя інструктары ад нікчэмнай пісаніны. Напрыклад, інструктар **Брум** загатаўляе ў дзесятку экземплярах стандартныя запіскі і раздае іх парторгам. Вось узор яго «вынаходніцтва»:

«Парторгу т. Голіку.

1. Забяспечыць палітзанятки комсамольскай групы адзін раз у тыдзень.

2. Распрацаваць другі раздзел даклада тав. Сталіна.

3. Паставіць масавую работу па ахопу падпіскай на пазыку.

4. Выпусціць да 20 красавіка насценную газету» і т. д.

Навошта гэта кручкатворства? Хіба не лепш пагаварыць з парторгам па асноўных пытаннях работы і **параіць** яму як лепш не правесці.

Як-бы не прэтэндавала гэта пісаніна на канкрэтнасць, усё-ж яна застаецца толькі паказальнікам **фармальных** адносін тав. Брума да справы.

Калі т. Лейман гаворыць аб сваёй рабоце, у яе голасе адчуваецца нездаваленне неакрэсленасцю свайго становішча. Яна вылучана інструктарам па зоне дзейнасці МТС. Ніякіх указанняў у рабоце не атрымлівае ні ад райкома, ні палітаддзела. Як толькі з'явілася тав. Лейман у палітаддзел, яе выбралі сакратаром парткома МТС, а як ін структару далі пачку сельскараўскіх допісаў і прапанавалі расследаваць.

Допісы, відома, каштоўны дапа можны матэрыял для інструктара. Але абмяжоўваць дзейнасць інструктара толькі расследваннем гэ тых допісаў—значыць не разумець задач інструктара.

Сумяшчэнне інструктарскай работы з работай сакратара парткома МТС не мэтазгодна, бо асноўная работа інструктара—ў сельсоветах і калгасах.

Такія-ж арганізацыйныя недахопы і дапушчаны і пры вылучэнні і прымацаванні да калгасаў парторгаў. Многа прымацаваных з раённага партактыва да калгасаў парторгаў лічацца парторгамі па месцы сваёй пастаяннай работы. Так, напрыклад, парторг леспрамгаса т. **Найдунаў** прымацован парторгам і да калгаса. Парторг ільназавода т. **Вярбіцкі** адначасова з'яўляецца парторгам і ў калгасе. Таксама «двойчы парторгамі» з'яўляюцца тт. **Савік, Шведук, Сіжэвіч, Пакроеў** і інш. Некаторыя з гэтых таварышоў, напрыклад, парторг Найдунаў, спасылаючыся на падвойную нагрузку прыкрываюць сваю бяздзейнасць і на месцы пастаянна работы, і ў калгасах.

Я. Ів.

ПАРТОРГ КІРУЕ НЕ ПРАТАКОЛАМІ, А Ў БРЫГАДЗЕ І НА ПОЛІ

(Ад полацкага карэспандэнта «Звязды»)

Партыйнае ядро ў калгасе «Чырвоная зорка», Экіманскага сельсавета, вельмі малое: усяго два члена партыі. Не гледзячы на малую колькасць партыйцаў, парторг **Казанаў** здолеў добра перабудаваць партыйна-масавую работу.

Намеснік начальніка палітаддзела тав. **Стронгін** разам з парторгам распрацавалі канкрэтны план работы парторга па пяцідзеўках.

Парторг Казанаў перш-на-перш ўзяўся за арганізацыю прапрацоўкі рашэнняў XVII з'езда партыі сярод калгаснікаў, увязваючы іх з практычнай работай у калгасе.

Калгас «Чырвоная зорка» з'яўляецца прыгарадным садова-агародным калгасам. Адсюль галоўная задача—угнаенне палёў. Калгаснікі ўзяліся за вывазку гною. Замест 800 тон, якія трэба было вывезці па плану, вывезена 1.800 тон.

Тав. Казанаў арганізаваў у калгасе тры аграгурткі, у якіх займіліся ўсе калгаснікі. Калгаснікі паляводчай брыгады займаліся ў паляводчым гуртку, гароднікі—у гуртку па вывучэнню гародніны і жывёлаводы—ў гуртку па вывучэнню жывёлагадоўлі. Сам Казанаў кіраваў гуртком па гароднінe. На аграэкзамене пры палітаддзеле Казанаў адказваў на «выдатна».

Другі член партыі **Юр'еў** Сяргей працуе загадчыкам МТФ і СТФ. Ён арганізаваў работу на фермах так, што адыход парасят пры апаросе, які ў калгасе даходзіў да 30-40 проц., цяпер не перавышае 2-х проц.

Парторг калгаса Казанаў і член партыі Юр'еў зразумелі, што галоўнае — рэалізацыя рашэнняў XVII партз'езда. Добра праведзеная растлумачальная работа па брыгадах дала свае рэальныя вынікі.

Калі паляводчая брыгада **Дзятлава Сяргея** і гародная брыгада **Кур'янава** выйшлі на поле, —кожны калгаснік ведаў што яму трэба рабіць, ведаў, што ад яго работы залежыць ацэнка яго працадня.

Не забыў тав. Казанаў і аб масавай рабоце. Ва ўсіх брыгадах вылучаны чытальнікі і рэдактары насценгазет. Брыгады спаборнічаюць паміж сабою на хутчэйшае і добраякаснае правядзенне сяўбы. Вынікі спаборніцтва кожную пяцідзеўку публікуюцца ў насценных газетах.

Праведзены нядаўна аграэкзамен паказаў, што калгаснікі добра ўсвоілі аграпраграму ў гуртках. З 21 праверанага 5 адказала на «выдатна» (з іх 4 жанчыны), 4 на «добра» і 10 на «здавальняюча». Толькі 2 калгаснікі адказалі на «слаба».

Аграведы, атрыманыя ў гуртках, калгаснікі, прымяняюць на полі. Паляводчая брыгада не мела ні воднага выпадку ворыва ніжэй 16 сантыметраў. За ўвесь час не было ніводнага факту недобраякаснай работы як у паляводчай, так і ў агароднай брыгадах.

Парторг Казанаў кіруе не пратаколамі, не сходамі, а канкрэтнай работай з людзьмі ў брыгадзе, на полі, у кароўніку.

Н. НЕЙДЛІН.

ТОРФ

З ПЕРШЫХ-ЖА ДЗЕН—У ПРАРЫВЕ

Асінторф (Ад спец. карэспандэнта «Звязды»).

Не гледзячы на спрыяючыя ўмовы надворʼя, нарастанне тэмпаў здабычы торфу ідзе вельмі марудна. За 6, 7, 8, 9 мая дзённае заданне выконвалася на 51 проц. На 9 мая сезоннае заданне выканана на 6,5 проц.

Дагэтуль завербавана рабочых **2.270** чалавек замест патрэбных па плану **3.340**. Элеватарныя машыны адрэмантаваны. Але ў эксплаатацыю пушчаны толькі 13. Астатнія 6 машын бяздзейнічаюць з прычыны адсутнасці тросаў, элеватарных палотнаў і ланцугоў Галля. За першую пяцідзеўку мая 13 элеватарных машын выравілі **2.065.130** штук фармовачнага торфу замест **3** мільёнаў па плану.

За 4 дні работы 8 машын зрабілі **45** гадзін прастою з прычыны паўтарнасці рамонту транспарцёраў, кранштэйнаў, тамораў і другіх запасных частак. Горш таго. Элеватарныя машыны 30 проц. рабочага часу прастойваюць. Прычынай прастояў зʼяўляецца неарганізаванасць работы: няправільная расстаноўка рабочай сілы (асабліва кадраў, як асноўнай вядучай прафесіі на заводзе), адсутнасць дакладнага размеркавання абавязацельстваў і адказнасці паміж начальнікамі агрэгатаў, змен і брыгадзірамі. Культурна-масавая і выхаваўчая работа пастаўлена яшчэ слаба. З 25 брыгад толькі 13 уключыліся ў правядзенне ўсебеларускага конкурса па лепшую брыгаду.

Грамадскае харчаванне і індывідуальнае снабжэнне рабочых з прычыны адсутнасці транспарта і сродкаў перасоўвання пастаўлена пад пагрозу зрыву. Запасы прадуктаў харчавання на заводзе ёсць на 1-2 дні. Аршанскі чыгуначны вузел катэгарычна адмаўляецца перавозіць грузы са станцыі Орша да станцыі Асінаўка. Між тым, у Оршы ёсць розных грузаў завода каля **600** тон, з іх **100** тон бульбы, якая пачынае псавацца.

Белторф і аршанскія арганізацыі, ведаючы аб пагражаючым становішчы на заводзе, застаюцца ў ролі назіральнікаў, выказваючы толькі сваё спачуванне.

ПЕЦЯРЭНКА.

ЗАВОДЫ БЕЛТОРФА ЗА 8 МАЯ

	Дзённае задание	Машын	Брыгад	Працавала: Проц. вык. дзён. задания	Проц. сезон. задання
Асінторф	1260	14	28	52,9	6,5
«Чырвоны сцяг»	242	3	6	86,7	11,0
Імя Гея	268	5	9	110,8	9,3
Даўмана	46	1	1	28,2	23.5
«Свабода»	268	4	9	64,9	9,2
«Лукснае»	148	3	5	78,4	6,3
Дукоры	—	1	2	—	2,5

СПЛАЎ

У СПАБОРНІЦТВЕ НА ПЯРШЫНСТВА

Віцебская Заходняя - Давінская сплаўная кантора Лесбела займае па сплаву ў БССР значнае месца. Яна яднае 12 адміністрацыйных раёнаў, праз якія працякаюць 32 сплаўныя рэкі на працягласці 1200 клм. і мае 6 вытворчых участкаў па тэрытарыяльных адзінках.

Навігацыйны план гэтага года павінен даць нашай прамысловасці 628 тыс. кубаметраў строю і дроў, забяспечыць нашы новабудоўлі (Магнітагорск), Растоў на Дану і Дан бас, лесаматэрыяламі. Большая частка будаўнічага лесу пойдзе для віцебскіх заводаў (лесазаводу № 18, № 3, стандартнаму, інструментальна-мэблевай фабрыкі, фанернаму заводу ў колькасці 41 тыс. кубаметраў). Акрамя таго, кантора павінна даць для рабочых Віцебска 100 тыс. раўметраў дроў.

Галоўны шлях паспяхова правядзення сплаву — разгортванне соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сплаўшчыкамі, брыгадамі, участкамі. З гэтай мэтай віцебскай сплаўная кантора сумесна з гаркомам КП(б)Б выклікалі на соцспаборніцтва Гомельскую сплаўкантору і гарком КП(б)Б. У гэтым спаборніцтве мы ўзялі на сябе абавязацельства, да 1 ліпеня пусціць у сплаў 100 процантаў усёй падвезенай драўніны, даставіць да канчатковых пунктаў 75 проц. спушчанага замест уста ноўленых пастановай СНК БССР пуску да 15 ліпеня і даставіць на канчатковыя пункты 50 проц.

Як-жа ідзе ў нас зараз сплаў?

План сплаву за красавік выканан у цэлым на канторы па пуску 130,7 проц., па прыбыцці на 140,5 проц. Гэта перамога ў перавыкананні плана за красавік дасягнута пры непасрэднай дапамозе гаркома партыі і паасобных раённых партыйных арганізацый (Полацк — сакратар парткома Турлай, якія штодзённа апера тыўна кіравалі сплавам.

На фоне дасягненняў першага месяца сплаву мы яшчэ маем сур'ёзнейшыя недахопы. Паасобныя ўчасткі Суражскі — начальнік Крывой і інш.), яшчэ не паставілі справу барацьбы за промфінплан на належную вышыню.

У пастанове ЦК ВКП(б) ясна сказана аб неабходнасці перакліканьня комуністаў, комсамольцаў, маючых вопыт сплаўнай работы, непасрэдна на вытворчасць, паставіць масава-палітычную работу сярод сплаўшчыкаў, шляхам выдзялення для гэтай работы спецыяльных палітработнікаў.

Партыйная арганізацыя слаба раскачваецца на ажыццяўленне гэтай пастановы. Незабяспечая партыйны ўдзел у вытворчасці (сплаўучастак, брыгада і інш.).

Зусім дрэнна працуе прафарганізацыя на некаторых участках (Бешанковіцкі райком саюза — Талстой, Суражскі, Лёзненскі).

Рабочае снабжэнне на радзе ўчасткаў вытворчасці кепска пастаўлена. Віцебскі, Сіроцінскі і Лепельскі ОРС'ы працуюць дрэнна, у выніку чаго мы мелі перабой ў забеспячэнні сплаўшчыкаў прадуктамі (хлебам, цукрам, крупой, махоркай) пры наяўнасці гэткіх у Лепелі. Начальнік ОРС'а Астроўскі не турбаваўся аб своечасовай перакідцы фондаў з адна го ўчастка на другі.

Перад намі зараз яўная пагроза ў недахвацe драўніны. Нам неабходна прыняць усе захады, каб падвезці своечасова драўніну, інакш сплаўныя работы другога квартала будуць сарваны.

У спаборніцтве з Гомелем Віцебская сплаўкантора, можа і павінна дабіцца першынства па ўсіх паказальніках, праводзячы сапраўдную большавіцкую барацьбу за паспяховае выкананне сплава гэтага года.

МАРОН.

АМАТАРЫ РЭЗАЛЮЦЫЙ

(Пісьмо рабочага)

Рабочы 5-й брыгады прадзільнага корпуса **Магілеўскай шоўкавай фабрыкі Прыгоркаў** жыве ў вельмі дрэнных кватэрных умовах. У сувязі з заканчэннем будаўніцтва рабочага пасёлка ён падаў заяву ў цэхавы камітэт, па атрыманне кватэры.

Заява ўжо доўгі час ходзіць з рук у рукі. Астаюцца толькі слады рэзалюцый, а выдзікаў ніякіх. Цэхком заяву Прыгоркава накіраваў трыкутніку, трыкутнік дырэктару фабрыкі тав. **Нефедаву**, той у сваю чаргу загадчыку жылладдзела **Дорфману**. Усе накладаюць рэзалюцыі, а кватэры няма.

Калі скопчыцца гэтая бюракратычная цеганіна?

ДЗЯМ'ЯНАЎ.

ШКОДНІКІ З ЖЛОБІНСКАГА РАЙКОМГАСА

(Пісьмо селькора)

Жлобінскаму райкомгасу выдзелена на **1934** год у Азярынскай дачы **500** кбм. будаўнічай драўніны. Зімой драўніна была вырублена, але па віне галавацяпаў з комгаса не вывезена на прыстань.

З-за адсутнасці будматэрыялаў зараз зрываецца будаўніцтва ў раёне. Апрача таго вырублены лес ляжыць не акораны і псуецца. Калі дапусціць лес ляжаць далей, то за лета ён папсуецца.

Патрэбна зараз-жа прывесці ў парадак вырублены лесаматэрыял, прыняць усе меры, каб вывезці яго на бліжэйшыя прыстані і сплаваў паставіць у Жлобіне.

ДРАБЫШЭЎСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ: «Звязда» зварачае ўвагу пракурора Жлобінскага раёна і чакае паведамлення аб прынятых мерах на ўказаныя ў пісьме факты.

На сігналы газеты не рэагуюць

(Пісьмо работніцы кааперацыі).

Не раз газета **«Комунар Заслаўшчыны»** пісала аб безгаспадарчасці і п'янстве ў калгасе **«1 мая»**. Сігналы газеты асталіся без ўсякага рэагавання. Старшыня калгаса **Сташкевіч** сумесна з членам **Рагоўскага** сельсавета **Пухаўцом** па-ранейшаму бяздзейнічаюць і сістэматычна п'янствуюць.

У выніку гэтага малочна-таварная ферма не ўкамплектавана, амаль усе калгаснікі знішчылі маладняк цялят. У калгасе адсутнічае баранцьба за раннюю і добраякасную сяўбу.

Аб усім гэтым ведаюць у сельсавеце і раёне, але-ж мер ніякіх не прымаюць.

Патрэбна аздаравіць кіраўніцтва калгаса і ліквідаваць усе прарывы.

АРЛОЎСКАЯ.

ГУЛІС ЛЕЧЫЦЬ ЗА ХАБАРЫ

(Пісьмо студэнта).

Доктар Гуліс Замастоцкага медпункта, Менскага раёна здзекваецца над пасельніцтвам. Калі калгаснік сельгасарцелі «Комінтэрн» **Чыкатоўскі** звярнуўся да Гуліса за дапамогай, той адказаў, што няма лякарства, і адмовіўся агледзець хворага. І толькі калі Чыкатоўскі прынёс дзесятак яец, Гуліс згадзіўся аказаць медычную дапамогу і лякарства знайшлося.

Таксама Гуліс аднёсся да хворай Васілеўскай з вёскі Бярозаўка і калгасніцы Сержановіч Каці. Браць хабар у яго ўвайшло ў сістэму. Адносіны да наведвальнікаў вельмі грубыя.

Такім дактарам не месца ў совецкіх установах. Пракуратура павінна прыцягнуць Гуліса да судовай адказнасці.

ЛІШАФАЕЎ П.

Пракурор і раймілiцыя патурaюць злодзеям

(Пісьмо калгаснікаў)

У калгасе **«Чырвоная Бярозаўка»**, Бярозаўскага сельсавета (Мазырскі раён) у мінулым годзе ўкрадзена трое коней і карова. Злодзей **Багдан Сцяпан** і яго хаўра былі выяўлены і справа перададзена **мазырскай раймілiцыі**. Але раймілiцыя невядома, чаму гэту справу цягне і вынікаў ніякіх не чуваць.

Ужо некалькі раз пісалі ў райгазету **«Калгаснік Мазырщчыны»**, адкуль допісы накіраваны райпракурору. Але пракурор таксама паклаў гэту справу пад сукно. Гэтае патуранне пашырае поле дзейнасці для раскрадальнікаў калгаснай маемасці. Так, у сакавіку, у калгасе ўкрадзены тры племянных авінаматкі.

Неабходна прыцягнуць да адказнасці раскрадальнікаў грамадскай уласнасці і тых, хто ім патурае.

КАНАНЧУК Ц., ЛЕШЧАНКА, БАЖОК, КАНАНЧУК У

ТАК НЕЛЬГА РЫХТАВАЦЬ ПЕДАГАГІЧНЫЯ КАДРЫ

Гомельскі Педагагічны інстытут рыхтуе выкладчыкаў фізікі, матэматыкі, хіміі і біялогіі для сярэдняй школы.

Для падрыхтоўкі гэтых кадраў Наркомасветы павінен быў стварыць інстытуту вучэбна-матэрыяльную базу, абсталяваць лабіцеты, забяспечыць высокакваліфікаванымі выкладчыкамі.

Але ў кіраўніцтве Наркомасветы ў адносінах інстытута не выжыт яшчэ верхагляцкі падыход. Вось яркая ілюстрацыя. У 1930 годзе адкрыт гэты інстытут з двухгадовым курсам навучання. Прымалі туды пераважна людзей з асветай за сямігодку і нават нескончаўшых сямігодкі. Выкладчыкамі інстытута сталі гомельскія педагогі тэхнікумаў і некаторыя выкладчыкі масавай школы. Ітак Наркомасветы і кіраўніцтва інстытута за два гады навучання рыхтавалі з студэнтаў, без папярэдняй дадатковай агульна-адукацыйнай падрыхтоўкі, выкладчыкаў асноўных навук для сярэдняй школы. Зусім зразумела, што з інстытута выходзілі недавучкі, малапісьменныя на матыкі і фізікі, якія ці ў якім разе не маглі задаволіць патрабаванні сярэдняй школы

Нічога не змянілася ў рабоце інстытута і пасля гістарычных рашэнняў ВКП(б) аб школе 1931 і 1932 гг. і пасля рашэння ЦВК аб вышэйшай школе.

Толькі ў верасні 1933 года інстытут рэарганізоўваюць з двухгадовага ў трохгадовы. У лістападзе 1933 года зноў рэарганізоўваюць у чатырохгадовы.

Як праходзіла рэарганізацыя?

У верасні 1933 года інстытут атрымлівае загад НКА: «з гэтага часу вы пераходзіце на трохгадовы курс навучання». Праз некаторы час інстытут атрымаў новы навучальны план. Толькі пераключыўся інстытут на трохгадовы курс навучання, як праз два месяцы—зноў загад Наркомасветы аб пераходзе на чатырохгадовы курс навучання. Праз некаторы час атрыман новы навучальны план. Аб тым, як пераходзіць з аднаго курса навучання на другі, што і як рабіць з асобнымі дысцыплінамі, што пераносіць з аднаго курса на другі — гэтага не ведала і яшчэ цяпер не ведае кіраўніцтва інстытута. Самавольна пачалі пераносіць дысцыпліны з курса на курс, скарачаць і падаўжаць асобныя дысцыпліны. Адным словам, рабілі як папала. А Наркомасветы палічыў больш выгадным трымаць нейтральную пазіцыю—рабіце самі як хочаце і што хочаце.

Інстытут не забяспечан высокакваліфікаванымі педагагічнымі кадрамі. З 8-мі кафедраў толькі трыма загадваюць прафесары, астатнімі—дацэнты, выконваючыя абавязкі дацэнтаў і асістэнты. З трыццаці выкладчыкаў толькі палова працуе пастаянна ў інстытуце, а астатнія сумяшчаюць работу ў інстытуце з асноўнай работай у іншых навучальных установах. Галоўнай дысцыплінай на ўсіх аддзяленнях інстытута з'яўляецца матэматыка. Але няма ніводнага высокакваліфікаванага педагога-матэматыка. Курс матэматыкі вядзе выкладчык тав. **Альтшулер**, які не спраўляецца са сваімі абавязкамі. Па некалькіх дысцыплінах зусім няма выкладчыкаў. З прычыны адсутнасці выкладчыкаў на другім курсе хімічнага аддзялення не праходзілі хімічнай тэхналогіі, гісторыі КП(б)Б. На фізічным аддзяленні на другім курсе не праходзілі арганічнай хіміі.

У падрыхтоўцы педагога—фізіка, хіміка, біялога выключную ролю адыгрывае работа ў лабараторыях. Нельга сабе ўявіць прапрацоўку асноўных дысцыплін без практычнай работы студэнтаў у лабараторыях. Але фактычна ні лабіцетаў, ні лабараторый няма. У так званых «лабараторыях» менш розных прылад, чым у сямігадовай школе. У фізічным лабінеце няма вымяральных інструментаў, вельмі мала прылад па оптыцы, па электратэх ніцы. Яшчэ горш стаіць справа па хіміі і біялогіі. Такім чынам сапраўдную работу ў лабараторыях студэнты не вядуць, бо добрых лабараторый і прылад няма.

Доўгі час у дварцы-музеі быў надзвычай добра абсталяваны фізічны лабінет. Ён належаў гомельскаму гарАНА. Надумаліся чыноўнікі з гарАНА ліквідаваць лабінет і размеркавалі прылады па школах. Цяпер дзесяткі каштоўнейшых складаных машын, розныя прылады валяцца і не скарыстоўваюцца ў школах, бо яны там не патрэбны. А студэнты ў інстытуце бачаць гэтыя машыны і прылады толькі на малюнках у кніжках. Да гэтых бясчынстваў з боку гарАНА Наркомасветы не прыняў ніякіх мер.

Якасць вучэбна-педагагічнай работы далёка нездавальняючая. Асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца ніякі ўзровень агульна-адукацыйнай падрыхтоўкі студэнтаў. У пагоні за колькасцю студэнтаў кіраўніцтва інстытута ліберальна падыходзіла да прыёму ў інстытут. Прымаліся людзі без адпаведнай падрыхтоўкі. На першым курсе хімічнага аддзялення з 21 чал. прынята з адукацыяй сямігодкі 14 чал. На біялагічным аддзяленні з 20 студэнтаў прынята з адукацыяй сямігодкі 10 чалавек. Рабфакаўцаў прымалі зусім без залікаў. Рад студэнтаў не падаюць ніякіх надзей на ўсваенне курсу ВНУ і ўсё-ж кіраўніцтва інстытута ніяк не адважваецца іх выключыць. Выкладчык фізікі тав. **Голуб** скарджацца, што многія студэнты не ведаюць закона Архімеда і іншых, самых элементарных законаў пачатковай фізікі. Некаторыя выкладчыкі (псіхолагі, фізікі, матэматыкі) прама заяўляюць, што пры такім ніякім агульна-адукацыйным узроўні студэнтаў нельга прытрымлівацца праграмы педагагічнага ВНУ і таму прыходзіцца зніжаць курс на 10-15 проц.

Аб граматнасці і культурным узроўні студэнтаў і гаварыць няма чаго. Большасць студэнтаў пішуць няграматна. Гэтае з'явішча ў інстытуце лічыцца зусім нармальным: матэматык, фізік, хімік можа, моў, быць і малаграматным. Кіраўніцтва інстытута, парткамітэт і студэнцкія арганізацыі нічога практычнага не зрабілі для павышэння граматнасці студэнтаў.

Аб культурным узроўні студэнтаў сведчаць іх адказы ў запоўненай анкеце.

Студэнт першага курса фізічнага аддзялення адказвае, што «Отцы и дети» напісаў Гогаль, што Мейерхольд—вядомы мастак. Другія студэнты адказалі, што «Анну Каренину» напісаў Караленка, што Чайкоўскі—совецкі драматург, а Бетховен—народны артыст, што «Железный поток» напісаў Гогаль, «Демон» напісаў Горкі, «Гамлет» напісаў Пушкін. Адказы дзесяткаў студэнтаў паказваюць іх некультурнасць, адарванасць ад літаратуры, мастацтва, музыкі.

Вынікі такое становішча кіраўніцтва інстытута не прымае ні якіх мер, а ўсё займаецца статыстычнай апрацоўкай анкеты і разважаннямі аб пераводзе з другога інстытута ў Гомельскі якога небудзь аддзялення грамадскіх дысцыплін для культурнага ўплыву на студэнтаў.

Вялікай перашкодай ва ўсёй работе інстытута з'яўляецца недахват вучэбнай і жыллёвай плошчы. На 16 груп ёсць толькі 13 аўдыторый. Такое зусім не адпавядаюць ні педагагічным, ні санітарна-гігіенічным правілам. Зусім няма памяшкання для лабараторый і бібліятэкі. Студэнты размешчаны па 8-мі інтэрнатах, з якіх многія непрыгодны на жыллёвае памяшканне. Некаторыя інтэрнаты знаходзяцца на адлегласці 3-4 кіламетраў ад інстытута. Па плану Наркомасветы ў 1934 годзе інстытут павінен набраць 350 чалавек. Але ніводнага метра жыллёвай ці вучэбнай плошчы для новага набору няма. Ужо чацверты год будуецца інтэрнат для інстытута, і наўрад ці будзе ён скончан у гэтым годзе.

Гомельскі гарадскі камітэт партыі зусім мала звяртаў увагі на інстытут, часта нават перашкаджаў яго рабоце. Так, у 1932-33 навучальным годзе дырэктар інстытута тав. **Сташэўскі** па мабілізацыі гаркома 8 месяцаў знаходзіўся на раёне. У 1933-34 навучальным годзе, у часе самай напружанай работы інстытута, дырэктара мабілізуюць на раён. Выкладчыка гісторыі КП(б)Б, які яшчэ не паспеў прыступіць да чытання свайго курсу, гарком мабілізаваў на раён. Так сарвалі курс гісторыі КП(б)Б.

Указанне тав. Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б) аб тым, што педагагічныя і медыцынскія факультэты ўсё яшчэ знаходзяцца ў нас у загоне і што гэты недахоп мяжуе з парушэннем інтарэсаў дзяржавы поўнасцю адносіцца да Гомельскага інстытута. Але прыведзеныя факты паказваюць, што Наркомасветы пасля гэтых гістарычных слоў тав. Сталіна ніякіх практычных нываваў па паляпшэнню кіраўніцтва педінстытутамі не зрабіў.

З гэтым недахопам трэба абавязкова пакончыць. І чым хутчэй будзе гэта зроблена, тым лепш.

Брыгада «Звязды»: **ПАЛЯШЧУК, БЯРОЗКІН, БАРТКЕВІЧ.**

ПОЛЬСКА-РУМЫНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ВЕНА, 11 мая, (БЕЛТА).

Польскі міністр замежных спраў БЕК прыбыў у бухарэст і меў гутарку з **ТЫТУЛЕСКУ.**

Ад перагавораў Бека ў Бухарэсце чакаюць устанаўлення больш інтэнсіўнай сувязі паміж Румыніяй і Польшчай і скарыстання румынапольскага саюза для вырашэння актуальных сусветных палітычных праблем.

ПАРЫЖ, 11 мая. (БЕЛТА).

«Ордр» у артыкуле аб паездцы Бека ў Бухарэст указвае, што польска-румынскі ваенны саюз быў накіраван супроць СССР.

— Цяпер-жа,—піша газета,—з паляпшэннем адносін паміж СССР, Польшчай і Румыніяй, «асноўная мэта польска-румынскай дыпламатыі страціла ў вялікай меры сваё значэнне».

— Калі Варшава і Бухарэст,—тавор ыць далей газета,—адчуваюць зараз патрэбнасць захаваць саюз, то толькі з намерам надаць яму больш шырокі характар.

ВАРШАВА, 11 мая, (БЕЛТА).

Паводле слоў «Газеты варшавскай» прадаўжэнне пакта аб ненападзе паміж СССР і Польшчай разглядаецца пытанне аб неурэгуляваных да гэтага часу адносінах паміж Румыніяй і СССР.

На думку газеты, нельга сабе ўявіць, каб гэтае пытанне не было закранута у перагаворах паміж Бекам і Тытулескуў Бухарэсце. Паводле слоў газеты, Польшча, выходзячы са сваіх саюзных адносін з Румыніяй, павінна садзейнічаць адпаўленню дыпламатычных адносін паміж СССР і Румыніяй.

ВЕНА, 11 мая. (БЕЛТА).

Як паведамляе румынскае агенцтва «Радор», у ходзе гутарак Бек і Тытулеску канстатавалі моцнасць польска-румынскага саюза і рашылі ў будучым ад часу да часу сустракацца для ўзгаднення знешняй палітыкі Польшчы і Румыніі.

Згодна слоў «Радор», Тытулеску ў тосце падкрэсліў, што «Польшча і Румынія хочуць аставацца гаспадарамі сваіх тэрыторый без усякага ўмяшання з боку і стараюцца ператварыць польска-румынскі саюз у ядро магутнай агульна-еўрапейскай арганізацыі».

УРАДАВЫ КРЫЗІС У БАЛГАРЫІ

ВЕНА, 10 мая (БЕЛТА).

Скрыты ўрадавы крызіс у Балгарыі, які, прадаўжаўся некалькі тыдняў, прыняў учора адкрытую форму.

Апазіцыя, якая складаецца ў асноўным з фашысцкай дэмакратычнай змовы, выказала недавер'е прадстаўніку радыкалаў ва ўрадзе — міністру шляхоў зносін Кастуркову.

Да апазіцыі далучыліся дэпутаты ўрадавага «сялянскага саюза» і лібералаў. У рэзультаце Кастуркоў быў скінут. Тым не менш радыкалы парашылі не ўходзіць з урада, калі замест Кастуркова партфель міністра шляхоў зносін будзе перадан радыкалу, а імянно Генаву.

У процівагу гэтаму міністры з «сялянскага саюза» і партыі лібералаў пагражалі адстаўкай пры задаволенні патрабаванняў радыкалаў.

Нечакана учора падаў у адстаўку таксама ваенны міністр генерал Кісноў, на месца якога быў неадкладна назначан генерал Вашеў. Гэта змяненне ў кіраўніцтве ваеннага міністэрства адбылося па прамому жаданню караля і выклікала ў палітычных колах сенсацыю. Лічацца з магчымасцю адстаўкі ўсяго кабінета.

„НЬЮ-ЮРК ІВНІНГ ПОСТ" АБ ПРАБЛЕМЕ ДАУГОУ

НЬЮ-ЮРК, 11 мая (БЕЛТА).

«Нью-Юрк івнінг пост» піша:

«Пасля аднаўлення совецка-амерыканскіх адносін амерыканскія прамыслоўцы і фермеры, а таксама беспрацоўныя чакалі значнага ажыўлення гандлю. Спадзяваліся што экспартна-імпартны банк неадкладна пачне сваю дзейнасць. Аднак, чаканні не збыліся: замест садзейнасці ажыўленню гандлю ўрад настаяў на незбходнасці спачатку ўрэгуляваць пытанне аб даўгах. Уключэнне СССР у лік дзяржаў-неплацельшчыкаў несправядліва і неразумна. СССР не адмаўляўся падобна Францыі ўрэгуляваць пытанне аб сваіх абавязацельствах».

Газета падкрэслівае, што сродкі, адпушчаныя амерыканскім урадам ураду Керэнскага, былі выдаткаваны у значнай ступені на патрэбы Калчака і Врангеля. «Якое апраўданне можам мы выставіць, трэбуючы ад СССР уплаты 187 млн. даляраў, якія былі патрачаны на снабжэнне контрэвалюцыйных войск, якія змагаліся супроць СССР?»

МАСАВЫЯ ЭПІДЭМІІ У БЕСАРАБІІ

Як паведамляе бухарэсцкая дэмакратычная газета «Адэвэрул», эпідэмія тыфа ў Бесарабіі прыняла такія выключныя размеры, што румынскі міністр аховы здароўя Кастынеска палічыў патрэбным выехаць у Кішынеў, каб зрабіць расследаванне на месцы.

«Бескарысна задавацца пытаннем, — піша газета, — ці ўзнік тыф, які зараз робіць велізарныя спусташэнні ў гэтай правінцыі, з рассаднікаў гэтай хваробы, якія захаваліся з часоў вайны, ці ён з'яўляецца рэзультатам новага занясення заразы. Ва ўсякім выпадку верна адно, што гэта хвароба нужды прыняла нарэшце ў Бесарабіі такія велізарныя размеры, што прадстаўляе сапраўдную небяспеку для ўсёй астатняй краіны. Калі гэта эпідэмія магла атрымаць такое магутнае развіццё, дык гэта таму, што ўмовы, у якіх жыве бесарабскае насельніцтва, не падаюцца ніякаму апісанню.

Сапраўды, міністр Кастынеска заявіў, што ён не думаў сустрэць такую нужду сярод сялянскага насельніцтва гэтай правінцыі. Уладная камісія прыняла меры гігіенічнага парадку і пастанавіла пабудаваць лазні ў населішчах, дзе больш за ўсё панырана эпідэмія.

Аднак, думаем, што ўрадавыя мерапрыемствы не павінны гэтым абмежавацца. Урад абавязан падумаць і аб палепшэнні эканамічных умоў у Бесарабіі, бо калі лазні і знішчае бактэрыі, то бедная неадкладна стварае новыя».

ПАЖАРЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 11 мая. (БЕЛТА).

З Лодзінскага і Вальынскага ваяводстваў паведамляюць аб пажарах, прынёўшых у сувязі з засухай і вятрамі выключна буйныя размеры.

У вёсцы Дмосін пажарам знішчана 100 сялянскіх гаспадарак. У мястэчку Здунска Воля згарэлі 4 рабочыя дамы. У вёсках Кастопальчэна, Дубенецкага, Ковельскага і Кжэменецкага паветаў пажарам знішчаны 22 сялянскія гаспадаркі. Каля Кремянца згарэла каля 50 гектараў лесу.

Друк выказвае апаскі, што калі засуха прадоўжыцца яшчэ тыдзень, неўраджай у полі стане немінучым.

БУЙНЫЯ ПЕРАМОГІ КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ПАРЫЖ, 9 мая.

«Юманітэ» паведамляе, што 3-я кітайская Чырвоная армія атрымала вялікую перамогу на Фуцзянскім фронце. Ёю заняты горад Куйгуа і важнейшы стратэгічны пункт Юнтан. Захвачана больш 8 тысяч вінтовак і 10 гармат.

Выходзячая ў Гон-Конгу газета «Кон-Пао» піша, што войскі Чан Кай-шы панеслі згрэмаздныя страты на ўсходнім фронце Фуцзяна. 5 палкоў 21-й і 22-й дывізій зусім разбіты. На бок Чырвонай арміі перайшла вялікая колькасць гаміндапаўскіх салдат, прынесшых з сабой 7.000 вінтовак.

Па вестках кітайскай совецкай прасы, атрад 2-й Чырвонай арміі з 3.000 чалавек, пранікны ў Сычуанскую правінцыю, павялічыў свае рады да 6000 чалавек, за лік далучыўшыхся да яго партызан.

СЯЛЯНСКІЯ ПАЎСТАННІ Ў МАНЧЖУРЫІ

ЛОНДАН, 9 мая.

«Дэйлі Уоркер» змяшчае матэрыялы аб значным пашырэнні паўстанцкага руху ў Манчжурыі, у асаблівасці, у далёкіх раёнах Сунгары, дзе японска-манчжурскі ўрад за бірае зямлю ў сялян і перадае яе японскім разервістам-перасяленцам.

Як паведамляюць з Харбіна, сялянскі рух супроць японскіх акупантаў пашырыўся таксама і ў сярэдняй частцы Сунгары. У часе разгарнуўшыхся баёў у гэтым раёне быў знішчан японскі карны атрад. Таксама і ў другіх баях, японцы панеслі цяжкія страты.

Баі паміж японскімі войскамі і партызанскімі атрадамі, якія дзейнічаюць разам з узброенымі сялянамі і перайшоўшымі на іх бок манчжурскімі часцямі — прадаўжаюцца.

У паўночна-заходняй частцы Гірынскай правінцыі 7.000 паўстанцаў занялі многа пунктаў.

У Мукдэнскай правінцыі, не гледзячы на палёўнасць многіх японскіх карных атрадаў, існуць бязупынныя баі.

Уся ўсходняя частка правінцыі знаходзіцца ў руках паўстанцаў, за выключэннем гарадоў, размешчаных уздоўж Мукдэн-Хайлунскай чыгункі.

Каравілы, аб'яднаўшыя з паўстаўшымі манчжурскімі часцямі, вядуць супольна барацьбу пад лозунгам «вызвалення Манчжуріі і Карэі ад японскага імперыялізма».

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

ВЕНА.

У Зальцбургу адбыўся сход, на якім выступілі з прамовамі канцлер Дольфус і віцэ-канцлер Штарэмберг. Апошні асабліва падкрэсліў гатоўнасць аўстрыйскага ўрада супрацоўнічаць з нацыянал-соцыялістскай Германіяй пры ўмове захавання незалежнасці Аўстрыі.

ВЕНА.

Паводле афіцыяльнага паведамлення, у розных мясцах Зальцбурга нацыянал-соцыялістамі кінута 10 бомб і ўзарыўчатых патронаў. На аэрадроме, на якім знаходзіўся самалёт з Дольфусам і Штарэмбергам, знойдзена нікельная машына з механізмам гадзіннікам.

БЕРЛІН.

Брэменскі суд прыгаварыў 17 комуністаў к катарзе і турме за актыўную падпольную работу.

У ЦВК БССР

АБ РАЗГЛЯДЗЕ ЗАЯЎ ПРАЦОЎНЫХ

Прэзідыум ЦВК БССР абмеркаваў пытанне пра разгляд заяў працоўных.

Адказным за своечасовы разгляд і вырашэнне скаргаў, падаваемых на імя ЦВК БССР, назначан член прэзідыума ЦВК БССР, загадчык прыёмнай ЦВК тав. **ДУБАУЦОЎ.**

Персанальная адказнасць за пастаноўку работы па разгляду скаргаў у раёнах ускладзена на старшынь РВК і сельсоветаў. Усім пар каматам, цэнтральным установам, РВК і советам забаронена перасылаць скаргі на разгляд тых устаноў, арганізацый і асоб, на ўчынкі якіх паданы скаргі.

Заявы і скаргі ад працоўных па вінны прымацца на працягу ўсяго рабочага дня, у перабочы час і выходныя дні.

Чырвонаармейскія скаргі, якія не патрабуюць спецыяльнага расследвання, звязанага з выездам, павінны разглядацца не пазней 7 дзён пасля падачы заявы, а ўсе іншыя, — не пазней 20 дзён.

Советы і райвыканкомы як правіла павінны разглядаць скаргі ў прысутнасці саміх скаргаўшчыкоў і прадстаўнікоў зацікаўленых арганізацый. Забараняецца механічная перасылка скаргаў у ніжэйшыя органы.

Работнікі па скаргах сістэматычна даюць справаздачы аб сваёй рабоце на рабочых і калгасных сходах.

Неправільныя дзеянні або рашэнні, што выклікалі скаргі, павінны быць неадкладна скасаваны.

Пракуратура абавязана ўзмацніць кантроль за своечасовым і правільным разглядам скаргаў працоўных мясцовымі органамі, а таксама за своечасовым выкананнем рашэнняў, прынятых па скаргах. Вінаватых у цяганіне, у фармальна-бюракратычных адносінах да скаргаў неабходна прыцягваць да судовай адказнасці. (БЕЛТА).

У СОУНАРКОМЕ БССР

Соўнарком БССР вызначыў рад мерапрыемстваў па палепшэнню лекавай дапамогі працоўным.

Наркаматам аховы здароўя разам з прафесіянальнымі арганізацыямі і рабочымі-ўдарнікамі будзе праведзена абследаванне лекавых устаноў — больніц, амбулаторый, медыцынскіх пунктаў на прадпрыемствах.

Ва ўсіх лекавых установах пасада дырэктара больніцы і галоўнага доктара аб'яднаецца ў адной асобе з ускладаннем поўнай адказнасці за становішча і работу ўстановы на галоўнага доктара (ён-жа дырэктар больніцы).

Дзяржплану даручана ўключыць у план будаўніцтва на 1935 год сканчэнне пабудовы інстытута сацыялістычнай аховы здароўя і гігіены.

Менскаму горсовету прапанавана ў дакадны тэрмін прадаставіць памяшканне для адкрыцця трахаматознай лячэбніцы не менш чым на 50 ложак.

Для забеспячэння арганізаванага набору ў медыцынскія навучальныя ўстановы, Наркамату аховы здароўя дазволена арганізаваць 6-месячныя падрыхтоўчыя курсы для паступлення ў медыцынскія інстытуты на 400 чалавек і тэхнікумы — на 400 чалавек.

Для палепшэння абслугоўвання насельнай і торфазагатоўчай кампаніі павялічваецца колькасць разъязных медыцынскіх брыгад.

ЭКСКУРСІІ НА БЕЛАМОРКАНАЛ, УРАЛ, КРЫМ, КАУКАЗ

Наркомасветы і таварыства пролетарскага турызма арганізуюць з першага ліпеня масавыя экскурсіі лепшых настаўнікаў-ударнікаў БССР па наступных маршрутах: Масква—Ленінград, Крым, Каўказ і Урал. На Урале настаўнікі наведаюць Магнітагорск, Чэлябінск, Свярдлоўск і т. д.

Таварыства пролетарскага турызма праводзіць у гэтым годзе масавую экскурсію лепшых ударнікаў прадпрыемстваў, МТС, соўгасаў і калгасаў БССР на Беламорскі канал. У экскурсіі прымуць удзел 200 чалавек.

15 мая адкрываюцца турысцкія лагеры ў парку культуры і адпачынку і ў гарадскім садзе «Профінтэрн» (Менск). Кожны дзень праз лагеры будуць прапускацца 150 чалавек.

ПАДШЭФНАМУ БІРА-БІДЖАНУ

ВЯЛІКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ РАДЫЁВЕЧАР

Пастанова ЦВК СССР аб перафармаванні Біра-Біджанскага раёна ў Яўрэйскую аўтаномную вобласць будзе адзначана ў Менску 17 мая вялікім інтэрнацыянальным радыёвечарам.

Наркамсноб БССР у парадку шэфства адпраўляе дзецям Біра-Біджана вагон кандзіцерскіх вырабаў.

Наркам аховы здароўя БССР адпраўляе Біра-Біджанскаму курорту «Кульдур» партыю ложак, коўдраў, прасцірадлаў, пледаў, ялёнікаў, навалачак, ручнікоў і інш.

Рабочыя менскага завода «Комунар» адправілі падшэфнаму Біра-Біджанскаму раёну ў якасці першамайскага падарунку 20 пар цісковых прадметы сваёй вытворчасці.

НОВАЯ ГАСЦІНІЦА Ў МЕНСКУ

На рагу вуліц Універсітэцкай і Валадарскай у Менску пачалося будаўніцтва новай гасцініцы на 150 нумароў. Гасцініца будзе мець рэстаран, уласны аўтамабільны транспарт і іншыя дапаможныя прадпрыемствы.

У бягучым годзе будзе выведзен галоўны паліпавярховы корпус. Кубатура гасцініцы — 26.000 кбм. Кошт будаўніцтва — 1.100 тыс. рублёў.

Здача гасцініцы ў эксплаатацыю адбудзецца ў канцы 1935 года.

ХРОНІКА

Тры новыя магазіны—пасуда-гаспадарчых тавараў, фота-тавараў і абутку адкрывае Менгандаль у маі.

2.700 тыс. рублёў адпушчана на капітальнае будаўніцтва паперовых фабрык БССР.

36 яслей адкрыта інспектурай аховы здароўя ў калгасах і соўгасах Гомельшчыны.

Шахматы і шашкі

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЕРСКАГА

Этюд № 5

І. Е. Каменскага (м. Урэчча)

(Друкуецца ўпершыню)



Бел: дамка g6 прост. b2, f4 (3)

Чорн. прост. a5, a7, b4, d4 (4).

Белыя пачынаюць і выйграюць

Канцоўка № 2

І. М. Храпуновіча (Віцебск)

Бел. прост.: a1, b2, b4, c1, c3, d2, d4, e3, f2, f4, g3 (11).

Чорн. прост.: a5, a7, d6, d8, e7, f6, f8, g5, g7, h6, h8 (11).

Белыя пачынаюць і выйграюць

Шахматная партыя іграна ў Магілеве 2 мая 1934 г. Белыя **Сташэўскі** (Магілеў). Чорныя **Жудро** (Віцебск).

1. Kg1—f3, d7—d5; 2. b2—b3. Kg8—f6; 3. Cc1—b2, Cc8—f5; 4. e2—e3, e7—e6; 5. c2—c4, c7—c6; 6. d2—d3 (заслугоўвала ўвагі Cf1—d3, потым 0—0 і ўжо ў залежнасці ад ходаў чорных d3 ці d4) 6... Kb8—d7; 7. Kb1 d2, Cf8—d6 (чорныя падрыхтоўваюць аўладанне пунктам e5); 8. Фd1—c2, e6—e5; 9. e3—e4, Cf5—g6; 10. Cf1—e2 Фd8—e7; 11. 0—0, 0—0; 12. Kf3—h4 d5:e4; 13. Kh4:g6, h7:g6; 14. d3:e4, Л1—e8; 15. Лa1—d1, Лd8—d8; 16. Лf1—e1, Kd7—f8; 17. Kd2—f3, Kf6—h7; 18. Лd1—d3, Kf8—e6; 19. g2—g3, Kf6—g5 (чорныя выклікалі аслабленне пазіцыі белых g2—g3; 20.Kf3:g5 Ke6:g5; 21 Cc2—f1 белыя не ідуць на ўскладненне Cg4, Kg5:e4, Лe4:f7—f5, (лічачы, што два слоны даюць больш шансаў) 21...Cd6—c5; 22. Лe1—e1, Cc5—d4; 23. Cf1—g2, Kg5—e6; 24. Cb2—c1, C6—c5; 25. h2—h4, Лd8—d6; 26. Cg2—f3, Лe8—d8; 27, Крg1—g2, Крg8—f8; 28. Лd1—h1, Крf8—e8; 29. h4—h5, g6:h5; 30. Лh1:h5, Крe8—d7; 31. Cc1—d2, Крd7—c7; 32. Cd2—c4 g7—g6. 33. Лh5:h7, Ke6—f8; 34. Лh7—f7—f5 (чорныя заняўшы сваім каралём спакойнае месца, прыступаюць да атакі пазіцыі караля белых) 35. a2—a3 (белыя ў сваю чаргу пачынаюць падсыхтоўку да атакі на караля чорных) 35...g6—g5; 36. g3—g4, f5—f4; 37. b3—b4, Kf8—g6; 38. Лh1—h5, Kg6 h4+; 39. Крg2—f1, Cd4+a1; 40 Лd3—b3, Kh4:f3; 41. Лb3:f3, Лd6—d1+; 42. Крf1—g2, c5:b4;43. Лf3—b3, Крc7—b8; 44. a3—b4, Фe7:b4; 45. Лb5—b7 (белыя пагражаюць Лb8—b3; 45 .. f2—f3+; чорныя фарсіруюць нічыю даволі эфектыўным спосабам; 46. Лb3:f3, Фb4—e1; 47. Лf3—f7, Фe1—f1+; 48. Крg3—f3, Лd1—d3+ 49. Cc1—e3 Лd3:e3+; 50. Крf3:e3 Ca1—d4+; 51. Крe3—f3, Cd4—b6; 52. Крf3—g3, Фf1—g1+ і нічыя.

ПА БССР

МАГІЛЕЎ. 1,2, 3 мая адбыўся матч на 5 дошках паміж камандамі Віцебска і Магілева. Склад віцебскай каманды: шахматы—майстар **Сліч, Жудро** і **Марушка** і шашкі—**Храпуновіч** і **Кагэн**; Магілеўскай: шахматы **Сташэўскі, Клюеў** і **Фёдараў** і шашкі—**Пеўзнер** і **Кугель**.

У шахматы было сыграна па тры партыі. З 9 партый Віцебск выйграў 7 і прайграў 2. На першай дошцы **Сташэўскі** (Магілеў) сыграў у нічыю з Сліччам і Жудро і прайграў Жудро. У шашкі сыграна па 2 партыі, з вынікам 3—1 у карысць Віцебска. Агульны вынік матча +10—3 у карысць Віцебска.

З удзелам віцебскіх ігракоў быў разыгран бліц-турнір па шашках. Першае месца заняў **Храпуновіч** (Віцебск) + 13 з пал. з 18. 2 і 3-е **Кагэн** (Віцебск) і **Кугель** (Магілеў) +13, 4-е **Пеўзнер** (Магілеў) + 10 з пал.

Паведамленне

13 мая Аддзел культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б у пакоі № 100, у 6 гадзін вечара, склікае нараду тт., прымацаваных да работы для дапамогі ў прапрацоўцы рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) па пытаннях вынікаў праведзенай работы.

На нараду павінны з'явіцца наступныя таварышы:

Дунец (НКАсветы), Чорны (Дзяржплан), Клімко (ВКСГШБ), Каляда (БДУ), Баран (БІМЗО), Кірушын (БелАН), Мельцэр (БелАН), Дзякоў (БДУ), Выдра (ВКСГШ), Саевіч (ВКСГШ), Рудзінкі (Соўправа), Шастакоў («Калтаснік Беларусі»), Васілеўскі (ВКСГШ), Джэлюк (рэд. «Звязды»), Лагодзіч (Партвыдат), Сыцько (БелАН), Давідовіч (Быхаў), Волкаў (В.П.І.), Панкевіч (БелАН), Шчарбакоў (БелАН), Башкевіч (НКАсветы), Хейфец («Рабочий»), Рубінштэйн (ЦСПСБ), Фядотка (курсы марксізма), Агурскі (Гістпарт), Фалкін (Радыёвузел), Звязькоў (Гістпарт), Прынц Аджіраў (ЦК ЛКСМБ), Мінкін (ЦК КП(б)Б), Немец (ВКСГШ), Драгілеў (КІЖ), Шінчук (ВКСГШ), Галанза (Соўправа), Окур (ВКСГШ).

Яўка ўказаных таварышоў абавязкова.

Заг. аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б КОНІК.

Адк. рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

УВАЗЕ ЎСІХ РАДЫЁСЛУХАЧОЎ, ЗАГАДЧЫКАЎ РАЙАДДЗЕЛАЎ І СУВЯЗІ І ТРАНСВУЗЛАМІ

На падставе пастановы СНК СССР ад 27 сакавіка 1934 г. № 656. з 1 студзеня 1934 года ўстанаўляюцца наступныя тарыфы і парадак аплаты абанементнай платы за карыстанне радыё

I. ТРАНСЛЯЦЫЙНЫЯ РАДЫЁВУЗЛЫ І ТРАНСЛЯЦЫЙНЫЯ РАДЫЁКРОПКІ АД ІХ

Усе ўстановы, арганізацыі, прадпрыемствы і адзельныя асобы, якія маюць трансляцыйныя радыёвузлы і кропкі, незалежна ад таго, якой арганізацыі або ведамству належыць радыёвузел, штомесячна за месяц наперад паміж 15 і 30 выслаўі ўносяць сваёму трансляцыйнаму вузлу абанементную плату, згодна наступнага дыферэнцыраванага тарыфу:

№№ па пар.	КАТЭГОРЫІ АБАНЕНТАЎ	Спаганяецца плата за месяц: За тэхн. абслугоўв.	За радыёслухан.	УСЯГО
1.	Рабочыя	1 р. 60 к.	80 к.	2 р. 40 к.
2.	Калгаснікі	1 р. 70 к.	80 к.	2 р. 50 к.
3.	Служачыя, сялянскія аднасобнікі, самаўжнікі і члены сем'яў вышеўказаных асобы свабодных прафесій	2 р. 30 к.	1 р. 20 к.	3 р. 50 к.
4.	Калектыўныя кропкі на грамадска-палітычных прадпрыемствах і арганізацыях	5 р. —	2 р. 50 к.	7 р. 50 к.
5.	Кропкі калектыўнага карыстання на прадпрыемствах нумарнога тыпу	12 р. —	6 р. —	18 р. —

УВАГА: 1) Належнасць да той ці іншай катэгорыі ўстанаўліваецца представленнем справак адпаведнай установы, прадпрыемства, арганізацыі.

2) Інжынерна-тэхнічны персанал, працуючы на вытворчасці, а таксама студэнты ВНУ і тэхнікумаў, якія карыстаюцца дзяржстыпендыямі, плацяць на стаўках рабочых.

3) Служачыя і пенсіянеры, якія атрымліваюць да 100 руб. і зарабляюць адзінымі работнікамі сем'і, плацяць на стаўках рабочых.

II. ЛАМПАВЫЯ І ДЭТЭКТАРНЫЯ РАДЫЁПРЫЁМНІКІ

Усе ўладальнікі лампавых і дэтэктарных радыёпрыёмнікаў не пазней 15 мая 1934 года абавязаны ўнесці абанементную плату за слуханне радыёперадачы ў першым паўгоддзі 1934 года па наступнаму тарыфу:

1) за дэтэктарны прыёмнік . . . 3 р. у год
2) за лампавы прыёмнік індывід. карыст. . . 24 р. у год
3) за лампавы прыёмнік калектыўнага карыст. . 36 р. у год
4) за лампавы прыёмнік агульнапублічнага карыстання (з камерц. прадпрыемств.) . . . 50 р. у год

Узнос абанементнай платы праводзіцца шляхам набыцця ў бліжэйшым паштова-тэлеграфным прадпрыемстве абанементнай карткі з аплатай збору за паўгоддзе.

За трэці квартал ліпень—верасень (включна) і чацверты квартал (кастрычнік-снежань (включна) 1934 года ўплата абанементнага збору будзе праводзіцца шляхам набыцця спецыяльных радыё-марак, выпускаемых Наркамсувязі, з наклейкай гэтых марак сам радыёслухачом на раней набытую абанементную картку.

АПОШНІЯ ТЭРМІНЫ ЎНОСУ АБАНЕМЕНТНАЙ ПЛАТЫ:

За III квартал—не пазней 15 ліпеня.
За IV квартал—не пазней 15 кастрычніка.

III. ЛЬГОТЫ:

Ад абанементнай платы за радыёслуханне вызваляюцца поўнасцю.

УВАГА: а) сялянкі, на справках, выдаваемых мясцовымі сабесамі.

За тэхнічнае абслугоўванне трансляцыі сялянкі карыстаюцца скідкай у памеры 50 проц.

б) Радыёаматары, якія вядуць эксперыментальную работу, па справках, выдаваемых камітэтам па радыёфікацыі і радыёвяшчанню пры СНК БССР па представленню камітэта сакрэтарыяту радыё пры ЦК ЛКСМБ.

АТРЫМЛІВАЮЦЬ СКІДКІ Ў РАЗМЕРЫ 50 ПРОЦ. З УСІХ ВІДАЎ АБАНЕМЕНТНАЙ ПЛАТЫ ПА ПРАДСТАЎЛЕННЮ АДПАВЕДНЫХ ПАСВЕДЧАННЯЎ:

1) Былыя чырвоныя партызаны і чырвонагвардэйцы, 2) персанальныя пенсіянеры, 3) асобы, узнагароджаныя ордэнамі Саюза ССР, 4) героі працы, 5) пенсіянеры, назбаўленыя магчымасці перасоўвання, па справках, выдаваемых мясцовымі сабесамі.

IV. АДКАЗНАСЦЬ ЗА НЯЎЗНОС АБАНЕМЕНТНАЙ ПЛАТЫ АБО ЎЗНОС ПА НЕАДПАВЕДНАЙ ТАРЫФНАЙ КАТЭГОРЫІ.

Пры выяўленні не ўзятых на ўлік, несвоечасова аплачаных або аплачаных не па адпаведнай тарыфнай катэгорыі трансляцыі ў трансляцыі і радыёпрыёмнікаў на вінаватых асоб, апрача спаганяння абанементнай платы, накладаецца штраф у памеры поўтара абанементнай платы.

Радыёаддзел Беларускага Кіраўніцтва Сувязі.

ПА МЯШКАННЕ ПОЛЬСКАГА ДЗЯРЖ. ТЭАТРА Совецкая, 29. тэл. 21-812.

Гастролі рускага Дзяржэўнага Тэатра БССР ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЗАСЛУЖ. АРТ. РЭСПУБЛІКІ **Вл. Вл. КУМЕЛЬСКАГА**

15-га мая — Адкрыццё сезона

Егор БУЛЫЧОЎ.

Пачатак у 8 з палов. гадз. вечара.

Гумары кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА". Гумары мастацкі фільм **ЦУДУ-ШКА ГАЛАУЛЕУ**

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Ад 7 мая **ЗОНГ**

Кіно КРЫЛЕТАРЫЙ. СЕННЯ НОВАЯ ПРАГРАМА

Радыёаддзел Беларускага кіраўніцтва сувязі даводзіць да ведама асоб, маючых радыёпрыёмнікі (дэтэктарныя і лампавыя), што ўсе ўладальнікі радыёпрыёмнікаў **абавязаны іх перарэгістраваць** у гарадскіх абраўчых радыёвузлах.

Тэрмін перарэгістрацыі—а **10 па 25 мая 1934 года.**

Пры перарэгістрацыі робіцца адзнака на абанементнай рэгістрацыйнай картцы, якая з штампам «перарэгістрована» вручаецца ўладальніку прыёмніка.

Усе прадпрыемствы, установы, арганізацыі і асобныя грамадзяне, не перарэгістраваўшыя сваіх радыёпрыёмнікаў вызначаны тэрмін, **будуць аштрафаваны** і прыцягнуты да судовай адказнасці як за ўхіленне ад абавязковай рэгістрацыі радыёпрыёмнікаў у адпаведнасці з пастановай Соўнаркома СССР ад 27 сакавіка 1934 года.

Кіно „СПАРТАК"

Ад 13 мая

мастацкі фільм

БАБЫ РАЗДЫСКІЯ

драма ў 6 частках.

У праграме Сэнсацыёнохроніка № 6

Згодна пастановы Менгорсовета ад 23 сакавіка 1934 г.

гр-не, маючыя жывёлу (коні і каровы), **павінны зарэгістраваць да 20 мая ў менскім гарадскім фінансавым аддзеле**

(Карла Маркса, 14, пакой № 10).

Незарэгістраваўшыя сваю жывёлу да паказанага тэрміна будуць аштрафаваны.

ГАРФА.

Выдавецтву „ЗВЯЗДА"

ПАТРЭБНЫ БУХГАЛТАР І ПОМБУХГАЛТАРА

Звяртацца: Совецкая, 63, да галоўбуха.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае **АСЕННІ НАБОР**

па наступных факультэтах і спецыяльнасцях:

I. Будаўнічы факультэт.

1. Інжынераў-будаўнікоў па вытворчаму, камунальнаму, жыллёваму і грамадзянскаму будаўніцтву (па гэтай спецыяльнасці набор раёнца і вячэрняя група без адрыву ад вытворчасці).

2. Інжынераў-будаўнікоў па цепласнабжэнню і вентыляцыі.

II. Энергетычны факультэт.

1. Інжынераў-электрыкаў па выпрацоўцы, размеркаванню і скарыстанню электрэнергіі.

2. Інжынераў цеплатэхнікаў па выпрацоўцы, перадачы, размеркаванню і скарыстанню цеплавой энергіі.

III. Торфа-меліярацыйны факультэт.

1. Горных інжынераў механікаў па эксплоатацыі—Рамонту тарфяных машын.

2. Інжынераў гідратэхнікаў-меліяратараў па асушэнню земель.

3. Горных інжынераў па дасследованню, падрыхтоўцы і эксплоатацыі торфяных радовішчаў.

IV. Хіміка-тэхналагічны факультэт.

1. Інжынераў-тэхналагаў сілікатнай прамысловасці па праектаванню, дасследованню і эксплоатацыі печаў і заводаў для вырабу важучых матэрыялаў, агнеўпора, кераміку і шкла.

Тэрмін навучання на ўсіх факультэтах да 5 з палов. год.

У інстытут прымаюцца з ведчы ў аб'ёме 9-годкі, рабфака або тэхнікума, ва ўзросце ад 18 да 35 год.

Прыём праводзіцца на дзённыя аддзяленні з адрывам ад вытворчасці, апрача адной вячэрняй групы на будфаку.

Стыпендыі і інтэрнатам студэнты забяспечваюцца згодна існуючых правіл.

У групу з адрывам ад вытворчасці (будфак) прымаюцца асобы, якія непасрэдна працуюць на вытворчасці.

Да заявы з указаннем спецыяльнасці прыкладзі наступныя дакументы: засведчаную анкету, характарыстыку аб працы, аб адукацыі, копію ваеннага білета, метрычны выпіс, аб соцпахаджанні і соцстановішчы, аб стане здароўя, дзве фота-карткі, паштовых марак на 40 кап., для сялян—копію акладнога ліста.

Іспыты праводзяцца па матэматыцы, фізіцы, хіміі, беларускай мове, рускай мове, грамадзяназнаўстве і малюнку для паступаючых на будфак.

Прыём заяў да 1-VIII г. г.
Іспыты з 5 па 10-VIII—34 года.
Пачатак заняткаў і верасня 1934 года.

Інстытут не прымае на свой кошт выдаткаў, звязаных з прыездам на іспыты.

Дакументы накіроўваць па адрэсу: **гор. Менск, Земляробчы вал, 4. Беларускі Пол. тэхнічны Інстытут.**

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

ПОЛАЦКІ ЛЕСАТЭХНІКУМ

абвяшчае **асенні ПРЫЁМ**

студэнтаў на 1 курс лесазагатоўчага аддзялення—64 чал, і лесагаспадарчага—30 чал. Прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодку, з спіскам на грамадзянаўству, беларускай мове і літаратуры матэматыцы, фізіцы і хіміі ў аб'ёме сямігодкі. Узрост паступаючых ад 16 да 30 год. Прыём заяў да 10 жніўня. Да заявы прыкладаюцца дакументы: аб нараджэнні, адукацыі, соцпыльным і матэрыяльным становішчы, для аднасобнікаў — акладны ліст за апошні год, даведку аб здароўі, засведчаную анкету, копію ваеннага дакумента, дзве фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак. Іспыты будуць праводзіцца з 20 па 30 жніўня. Пачатак заняткаў 1-га верасня 1934 г. Тэрмін навучання 3 з палов. г. Прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй у залежнасці ад паспяховасці ад 40 р. і вышэй.

Пры тэхнікуме ёсць уласная сталоўка і пральня.

Для лепшай падрыхтоўкі да асенняга набору асоб, скончыўшых раней сямігодку і школу калгаснай моладзі, пры лесатэхнікуме адкрываюцца 3-месячныя падрыхтоўчыя курсы на 60 чал. з пачаткам заняткаў 20-га мая. Да пачатку заняткаў курсанты прадстаўляюць камандыроўкі грамадскіх арганізацый і дакументы